NEC

# MultiSync PA242W
# MultiSync PA272W
# MultiSync PA302W

Даведнік карыстальніка



# Змест

Перасцярога, папярэджанне ....... Беларуская-1
Звесткі па рэгістрацыі ....... Беларуская-2
Парады па выкарыстанні ....... Беларуская-3
Функцыі вырабу ....... Беларуская-5
Камплект пастаўкі ....... Беларуская-5
Як пачаць карыстацца ....... Беларуская-6
Кіраванне ....... Беларуская-11
Функцыя PICTURE MODE (рэжым выявы) ....... Беларуская-17
Пашыранае меню ....... Беларуская-18
Характарыстыкі — PA242W ....... Беларуская-27
Характарыстыкі — PA272W ....... Беларуская-28
Характарыстыкі — PA302W ....... Беларуская-29
Функцыі ....... Беларуская-30
Пошук непаладак ....... Беларуская-32
Функцыя аўтаматычнай яскравасці ....... Беларуская-34
Унутраная каліброўка (толькі для мадэлі PA302W) ....... Беларуская-35
Капіяваць пункт белага (толькі для мадэлі PA302W) ....... Беларуская-37
Звесткі па перапрацоўцы і энергасілкаванні ....... Беларуская-39

## ПАПЯРЭДЖАННЕ

КАБ ПРАДУХІЛІЦЬ ПАЖАР АБО ЎДАР ЭЛЕКТРЫЧНЫМ ТОКАМ, НЕ ЗМЯШЧАЙЦЕ АБСТАЛЯВАННЕ ПАД ДОЖДЖ АБО Ў ВІЛЬГОТНЫЯ ЎМОВЫ. АПРОЧ ГЭТАГА, НЕ ЎСТАЎЛЯЙЦЕ ПАЛЯРНЫ ШТЭПСЕЛЬ У ПАДАЎЖАЛЬНІК АБО Ў ІНШЫЯ РАЗЕТКІ, КАЛІ ШТЫРЫ НЕ ЎСОЎВАЮЦЦА ЦАЛКАМ.

НЕ АДКРЫВАЙЦЕ КОРПУС: ТАМ ЗНАХОДЗЯЦЦА ЧАСТКІ ПАД ВЫСОКІМ НАПРУЖАННЕМ. ЗВЯРТАЙЦЕСЯ ДА КВАЛІФІКАВАНАГА ПЕРСАНАЛУ.

## ПЕРАСЦЯРОГА

ПЕРАСЦЯРОГА: ПЕРАСЦЯРОГА: КАБ ПАМЕНШЫЦЬ НЕБЯСПЕКУ АТРЫМАЦЬ УДАР ТОКАМ, УПЭЎНІЦЕСЯ, ШТО КАБЕЛЬ СІЛКАВАННЯ ВЫЦЯГНУЛІ З РАЗЕТКІ. КАБ ЦАЛКАМ АБЯСТОЧЫЦЬ СІЛКАВАННЕ АБСТАЛЯВАННЯ, ВЫЦЯГНІЦЕ КАБЕЛЬ СІЛКАВАННЯ З ГНЯЗДА ЗМЕННАГА ТОКУ. НЕ ЗДЫМАЙЦЕ НАКРЫЎКУ (АБО ЗАДНЮЮ ПАНЭЛЬ). УНУТРЫ НЯМА ЧАСТАК, ЯКІЯ МОЖА РАМАНТАВАЦЬ КАРЫСТАЛЬНІК. ЗВЯРТАЙЦЕСЯ ДА КВАЛІФІКАВАНАГА ПЕРСАНАЛУ.

Гэты знак папярэджвае, што напружанне на неізаляваных частках унутры прылады можа быць дастатковым, каб выклікаць удар электрычным токам. Таму дакранацца да ўнутраных частак абсталявання — небяспечна.

Гэты знак папярэджвае, што ў камплект пастаўкі ўваходзяць важныя інструкцыі па выкарыстанні і абслугоўванні прылады. Таму, каб пазбегнуць непаладак, варта ўважліва іх прачытаць.

**ПЕРАСЦЯРОГА:** выкарыстоўвайце кабель сілкавання, які пастаўляецца з гэтай мадэллю дысплэя, згодна з прыведзенаю ніжэй табліцай. Калі кабель сілкавання не ўваходзіў у камплект абсталявання, звяжыцеся з пастаўнікам. Ува ўсіх іншых выпадках выкарыстоўвайце дазволены ў краіне кабель сілкавання, які адпавядае напружанню зменнага току электрасеткі і стандартам бяспекі вашай краіны.

| Від штэпселя | Паўночнаамерыканскі | Еўрапейскі (кантынентальны) | Вялікабрытанія | Кітайскі | Японскі |
|---|---|---|---|---|---|
| Выгляд штэпселя |  |  |  |  |  |
| Краіна | ЗША, Канада | Еўропа (апроч Вялікабрытаніі) | Вялікабрытанія | Кітай | Японія |
| Напружанне | 120* | 230 | 230 | 220 | 100 |

*Калі дысплэй працуе з крыніцаю сілкавання напружаннем 125–240 В зменнага току, выкарыстоўвайце кабель, які адпавядае напружанню разеткі.

**ЗАЎВАГА.** Выраб абслугоўваецца і рамантуецца толькі ў той краіне, дзе яго набылі.

АС «Windows» — зарэгістраваны таварны знак таварыства «Microsoft».
«NEC» — зарэгістраваны таварны знак таварыства «NEC».
«ErgoDesign» — таварны знак ТАА «NEC Display Solutions», зарэгістраваны ў Аўстрыі, краінах Бенілюкса, Даніі, Францыі, Германіі, Італіі, Нарвегіі, Іспаніі, Швецыі, Вялікабрытаніі.
Усе іншыя гандлёвыя маркі і назвы вырабаў з'яўляюцца таварнымі знакамі або зарэгістраванымі таварнымі знакамі адпаведных уладальнікаў.
Лагатып «DisplayPort» і лагатып адпаведнасці стандарту «DisplayPort» — таварныя знакі, якія належаць «Асацыяцыі па стандартызацыі ў галіне відэатэхнікі» (VESA).

HIGH-DEFINITION MULTIMEDIA INTERFACE

«HDMI», лагатып «HDMI» і «High-Definition Multimedia Interface» — таварныя знакі або зарэгістраваныя ў ЗША і іншых краінах таварныя знакі ТАА «HDMI Licensing».

- Галоўным прызначэннем вырабу лічыцца выкарыстанне яго ў якасці інфармацыйнага тэхнічнага абсталявання ў офісе або ў хатніх умовах.
- Выраб далучаецца да камп'ютара і не прызначаны адлюстроўваць сігналы тэлевізійнага вяшчання.

# Звесткі па рэгістрацыі

## Заява Канадскага дэпартамента сувязі пра адпаведнасць

Гэтая лічбавая прылада класы Б адпавядае канадскаму стандарту ICES-003.

**C-UL:** мае адзнаку «C-UL» і адпавядае канадскім Патрабаванням бяспекі згодна з дакументам CAN/CSA C22.2 № 60950-1.

## Звесткі FCC

1. Каб не ствараць перашкоды тэлевізійнаму і радыёсігналу, з дысплэем «MultiSync PA242W/MultiSync PA272W/ MultiSync PA302W» выкарыстоўвайце кабелі, якія пастаўляліся разам з імі.

   (1) Кабель сілкавання, якім вы карыстаецеся, мусіць адпавядаць стандартам бяспекі ЗША і наступным умовам.

| | |
|---|---|
| Кабель сілкавання | Неэкранаваны, 3-правадны |
| Даўжыня | 2,0 м |
| Выгляд штэпселя |  ЗША |

   (2) Выкарыстоўвайце прыкладзеныя экранаваны кабель відэасігналу.
   Выкарыстанне іншых кабеляў і адаптараў можа перашкаджаць прымаць тэлевізійныя і радыёсігналы.

2. Гэтае абсталяванне выпрабоўвалі і прызналі яго адпаведнасць абмежаванням для лічбавых прылад класы Б згодна з часткаю 15 правілаў Федэральнага кіраўніцтва па сувязі (FCC, ЗША). Гэтыя абмежаванні распрацоўваліся, каб забяспечыць разумную абарону ад шкоднага ўплыву ў жылых памяшканнях. Гэтае абсталяванне стварае, выкарыстоўвае і можа выпраменьваць энергію прамежку радыёчастот, і калі яго ўсталяваць і выкарыстоўваць насуперак указанням, яно можа перашкаджаць радыёсувязі. Тым не менш, няма ніякае гарантыі, што перашкоды не будуць з'яўляцца ў кожным асобным выпадку. Калі абсталяванне перашкаджае прымаць тэлевізійны або радыёсігнал (што можна вызначыць, калі ўмыкнуць, а потым вымкнуць абсталяванне), карыстальнік можа паспрабаваць пазбавіцца перашкодаў адным ці некалькімі з наступных спосабаў:

   - Змяніць арыентацыю прыёмнай антэны або перамясціць яе.
   - Павялічыць адлегласць між абсталяваннем і прыёмнікам.
   - Далучыць абсталяванне да разеткі ў іншым ланцугу — не ў тым, ад якога сілкуецца прыёмнік.
   - Звярнуцца па дапамогу да прадаўца або да тэхніка, дасведчанага ў галіна радыё і ТБ.

   Калі неабходна, карыстальнік мусіць звярнуцца за дадатковыя парады да прадаўца або да тэхніка, дасведчанага ў галіне радыё і тэлебачання. Карысная можа быць наступная брашура, падрыхтаваная Федэральным кіраўніцтвам па сувязі (ЗША): «Як вызначыць і прыбраць перашкоды радыё і ТБ» (англ. «How to Identify and Resolve Radio-TV Interference Problems»). Гэты дапаможнік можна атрымаць па наступным адрасе: U.S. Government Printing Office, Washington, D.C., 20402, Stock No. 004-000-00345-4.

## Заява пра адпаведнасць

Гэта прылада адпавядае патрабаванням часткі 15 правілаў Федэральнага кіраўніцтва па сувязі (ЗША). Выкарыстоўваць прыладу дазваляецца пры выкананні наступных дзвюх умоў. (1) Прылада мусіць не ствараць перашкод і (2) мусіць прымаць любыя перашкоды, у тым ліку перашкоды, якія могуць выклікаць збоі ў працы.

| | |
|---|---|
| **ЗША, адказны бок:** | **NEC Display Solutions of America, Inc.** |
| **Адрас:** | **500 Park Boulevard, Suite 1100**<br>**Itasca, Illinois 60143** |
| **Нумар тэлефона:** | **(630) 467-3000** |

| | |
|---|---|
| Від вырабу: | дысплэй |
| Класіфікацыя абсталявання: | перыферыйная прылада класы Б |
| Мадэль: | MultiSync PA242W (PA242W)<br>MultiSync PA242W (PA242W-BK)<br>MultiSync PA272W (PA272W)<br>MultiSync PA272W (PA272W-BK)<br>MultiSync PA302W (PA302W)<br>MultiSync PA302W (PA302W-BK) |

*Мы заяўляем, што згаданае вышэй абсталяванне адпавядае тэхнічным стандартам, вызначаным у правілах FCC.*

# Парады па выкарыстанні

**Меры засцярогі і абслугоўванне**

КАБ ПРАЦАВАЦЬ БЫЛО ЯК МАГА ЗРУЧНЕЙ,
КАЛІ БУДЗЕЦЕ НАЛАДЖВАЦЬ МАНІТОР
І КАРЫСТАЦЦА ІМ, ПАМЯТАЙЦЕ:

- **НЕ АДКРЫВАЙЦЕ МАНІТОР.** Унутры няма частак, якія можа абслугоўваць карыстальнік, а калі адкрыць або зняць корпус, можна атрымаць удар электрычным токам або іншым чынам патрапіць у небяспеку. Звяртайцеся да кваліфікаванага персаналу.
- Не дазваляйце вадкасці трапляць у корпус, не карыстайцеся маніторам побач з вадою.
- Не ўстаўляйце ніякіх прадметаў у адтуліны ў корпусе, бо яны могуць дакрануцца да месцаў з небяспечным напружаннем, якое можа быць шкодным або смяротным і можа прывесці да ўдару электрычным токам, загарання, збою абсталявання.
- Не кладзіце важкія прадметы на кабель сілкавання. Пашкоджаны кабель можа выклікаць пажар або ўдарыць токам.
- Не стаўце прыладу на нахільную або няўстойлівую рухомую паверхню, стойку або стол, бо манітор можа ўпасці і сур’ёзна пашкодзіцца.
- Кабель сілкавання, якім вы карыстаецеся, мусіць адпавядаць стандартам бяспекі вашай краіны.
  (У Еўропе трэба выкарыстоўваць кабель «H05VV-F 3G» 1 мм$^2$ ).
- У Вялікабрытаніі з гэтым маніторам выкарыстоўвайце дазволеныя Брытанскім інстытутам стандартаў кабелі сілкавання са штэпселем, які мае чорны засцерагальнік (5 А).
- Не кладзіце на манітор ніякіх рэчаў і не выкарыстоўвайце манітор на адкрытай прасторы.
- Не згінайце кабель сілкавання.
- Не выкарыстоўвайце манітор ва ўмовах высокае тэмпературы, вільготнасці, у пыльных месцах і месцах, дзе збіраюцца алеістыя рэчывы.
- Не захіляйце вентыляцыйныя адтуліны манітора.
- Дрыжэнне можа пашкодзіць падсветку. Не ўсталёўвайце манітор там, дзе ён будзе працяглы час дрыжэць.
- Калі манітор або шкло разаб’ецца, не дакранайцеся да вадкіх крышталёў і будзьце асцярожнымі.
- Каб не даць перакуліць і пашкодзіць вадкакрышталёвы манітор падчас землетрасенняў ці іншага кшталту страсення, упэўніцеся, што вы ўсталявалі манітор у трывалае месца і прынялі меры, каб прадухіліць падзенне.

Пры ўмовах, пералічаных ніжэй, неадкладна вымкніце сілкаванне, адлучыце манітора ад разеткі і перамясціце яго ў бяспечнае месца, а потым звярніцеся да кваліфікаванага персаналу. Калі манітор трапляе ў пералічаныя ўмовы, гэта можа прывесці да падзення, загарання або ўдару электрычным токам:

- Калі стойка манітора трэснула або абдзерлася.
- Калі манітор хістаўся.
- Калі манітор нязвыкла пахне.
- Калі пашкоджаныя кабель сілкавання або штэпсель.
- Калі ў манітор пралілі вадкасць, або туды трапілі нейкія іншыя прадметы.
- Калі манітор трапіў пад дождж або ў ваду.
- Калі манітор упаў або пашкодзіўся корпус.
- Калі наступныя ўказанні па выкарыстанні выконваюцца, але манітор не працуе належным чынам.

ПЕРАСЦЯРОГА

- Забяспечце дастатковую вентыляцыю вакол манітора, каб цяпло магло належным чынам рассейвацца. Не захіляйце вентыляцыйныя адтуліны і не размяшчайце манітор у непасрэднай блізкасці ад батарэй ацяплення або іншых крыніц цяпла. Не стаўце нічога на манітор.
- Кабель сілкавання — галоўны сродак, які адлучае прыладу ад крыніцы сілкавання. Манітор трэба ўсталёўваць блізка да лёгкадаступнай электрычнай разеткі.
- Перавозьце манітор асцярожна. Захоўвайце для гэтага пакоўку.
- Не дакранайцеся да вадкакрышталёвае панэлі, калі манітор перавозіцца, усталёўваецца або наладжваецца.
  Націснуўшы на вадкакрышталёвую панэль, яе можна сур’ёзна пашкодзіць.
- Усталёўваць або перамяшчаць манітор трэба прынамсі ўдвух (толькі для мадэлі PA302W).
- Калі перамяшчаеце манітор, трымайце яго за ўбудаваную ручку і за ніжнюю частку корпуса (толькі для мадэлі PA302W).
- Нельга пераносіць манітор, трымаючы яго толькі за стойку (толькі для мадэлі PA302W).

Толькі для мадэлі PA302W:



**След выявы:** следам выявы называецца рэшта або «прывід» выявы, калі папярэдняя выява застаецца бачнаю на экране. У адрозненне ад ЭПТ-манітораў, след выявы на вадкакрышталёвых маніторах назіраецца не заўжды, але варта пазбягаць таго, каб на экране на працягу доўгі час адлюстроўвалася нязменная выява.

Каб аслабіць след выявы, вымкніце манітор на такі прамежак часу, на працягу якога адлюстроўвалася папярэдняя выява. Напрыклад, калі выява на маніторы не змянялася на працягу гадзіну і захавалася рэштkавая выява, манітор варта вымкнуць на гадзіну, каб сцерці выяву.

**ЗАЎВАГА.** Як і для ўсіх асабістых дысплэяў, таварыства «NEC Display Solutions» раіць або ўжываць рухомыя ахоўнікі экрана, якія запускаюцца праз пэўны прамежак бяздзейнасці экрана, або вымыкаць манітор, калі ён не выкарыстоўваецца.

КАЛІ МАНІТОР НАЛЕЖНЫМ ЧЫНАМ РАЗМЕСЦІЦЬ І НАСТАВІЦЬ, БУДУЦЬ МЕНЕЙ СТАМЛЯЦЦА ВОЧЫ, ШЫЯ І ПЛЕЧЫ. КАЛІ РАЗМЯШЧАЕЦЕ МАНІТОР, САЧЫЦЕ ЗА НАСТУПНЫМ:



- Каб прылада працавала найлепшым чынам, дайце ёй 20 хвілінаў, каб прагрэцца.
- Настаўце вышыню манітора так, каб верхні край экрана знаходзіўся на ўзроўні вачэй або крыху ніжэй. Калі зірнуць у сярэдзіну экрана, вочы мусяць глядзець крыху ўніз.
- Пастаўце манітор не бліжэй за 40 см (16 цаляў) і не далей за 70 см (28 цаляў). Найлепшая адлегласць — 50 см (20 цаляў).
- Давайце вачам адпачыць: час ад часу засяроджвайце позірк на прадмеце на адлегласці прынамсі 20 метраў. Часта міргайце.
- Каб паменшыць водбліскі і адлюстраванні, размяшчайце манітор пад вуглом 90 ° да вокнаў і іншых крыніц святла. Настаўце нахіл манітора так, каб святло лямпаў столі не адлюстроўвалася на экране.
- Калі адлюстраванае святло не дае нармальна бачыць выявы, выкарыстоўвайце фільтр супраць водбліскаў.
- Ачышчайце паверхню вадкакрышталёвага манітора мяккаю тканінаю без ворсу. Не выкарыстоўвайце чысцільныя сродкі, у тым ліку сродкі для шкла!
- Настаўце яскравасць і кантраснасць манітора так, каб было зручна глядзець.
- Выкарыстоўвайце трымальнікі дакументаў, размешчаныя блізка ад экрана.
- Размясціце тое, на што вы глядзіце большую частку часу (экран або даведачныя матэрыялы), наўпрост перад сабою, каб меней паварочваць галаву, калі друкуеце.
- Каб пазбегнуць «следу выявы» (эфект рэшткавае выявы), старайцеся зрабіць так, каб нязменлівыя ўзоры не адлюстроўваліся на маніторы доўгі час.
- Рэгулярна спраўджвайце зрок у лекара.

**Эрганоміка**

Каб працоўнае месца было як мага больш зручным, мы раім наступнае:

- Каб не стамляліся вочы, выстаўце сярэднюю яскравасць. У якасці ўзору яскравасці можна паставіць побач вадкакрышталёвым экранам аркуш белае паперы.
- Не выстаўляйце найбольшы кантраст.
- Са звычайнымі крыніцамі сігналаў ужывайце загадзя вызначаныя спалучэнні памеру і размяшчэння.
- Выкарыстоўвайце загадзя вызначаныя налады колераў.
- Выкарыстоўвайце сігналы з прагрэсіўнай разгорткай частаты 60 Гц.
- Не выкарыстоўвайце пераважна сіні колер на цёмным фоне, бо такое спалучэнне дрэнна ўспрымаецца, а недахоп кантрасту можа стамляць вочы.

**Як ачышчаць вадкакрышталёвую панэль**

- Калі вадкакрышталёвы дысплэй запэцкаўся, асцярожна пратрыце яго мяккаю тканінаю.
- Нельга церці вадкакрышталёвую панэль цвёрдым або грубым матэрыялам.
- Нельга націскаць на паверхню вадкакрышталёвага дысплэя.
- Нельга выкарыстоўваць арганічныя ачышчальнікі, бо яны могуць пашкодзіць або сапсаваць колер паверхні вадкакрышталёвага дысплэя.

**Як ачышчаць корпус**

- Адлучыце крыніцу сілкавання.
- Акуратна пратрыце корпус мяккаю тканінай.
- Каб ачысціць корпус, пратрыце спачатку тканінаю, змочанаю ў вадзе з нейтральным ачышчальным сродкам, а потым — сухою тканінай.

**ЗАЎВАГА.** У матэрыяле корпуса выкарыстоўваюцца пластмаса. НЕ АЧЫШЧАЙЦЕ корпус бензінам, разрэджвальнікамі, сродкамі на шчолачы і спірце, ачышчальнікамі для шкла і паліравання, воскам, пральнымі парашкамі або сродкамі ад насякомых. Не пакідайце гуму або вініл доўгі час кантактаваць з паверхняю корпуса. Ад пералічаных вадкасцяў і матэрыялаў фарба можа сапсавацца, адслоіцца або парэпацца.

Падрабязней пра здаровыя ўмовы працы можна даведацца, калі напісаць сюды: у арганізацыю Амерыканскага нацыянальнага стандарту для чалавечых фактараў аўтаматызаваных працоўных месцаў: ANSI/HFES 100-2007 — The Human Factors Society, Inc. P.O. Box 1369, Santa Monica, California 90406.

# Функцыі вырабу

- DisplayPort і HDMI, якія падтрымліваюць 10-бітную глыбіню колеру.
- 5 рэжымаў выявы з магчымасцю хуткае змены (гл. старонку 13).
- Дакладная колерапарадача для прафесійнай працы ў графічным дызайне (гл. старонку 17).
- Малы час прагрэву.
- Рэжымы падвоенага экрана «выява ў выяве» і «выява да выявы» з магчымасцю «жывога» прагляду (гл. старонку 14).
- USB-канцэнтратар з двума ўваходнымі партамі (гл. старонку 14).
- Праграма «MultiProfiler» пашырае функцыі кіравання колерам: аўтаматычныя абнаўленні профілю ICC (імітацыя профілю ICC профілю прынтара) — гл. старонку 17.
- Нізкае спажыванне энергіі з дапамогаю функцыі эканоміі (ECO MODE) — гл. старонку 12.
- Канструкцыя, якая памяншае вугляродны след.
- Унутраная каліброўка з дадатковым датчыкам (толькі для мадэлі PA302W).

# Камплект пастаўкі

Скрыня* з новым маніторам «NEC» мусіць змяшчаць наступнае:

- манітор «MultiSync» з падстаўкаю, якая дапасоўваецца па вышыні, нахіле, павароце і вертыкальным адхіленні,
- кабель сілкавання*[1],
- кабель відэасігналу (DVI-D — DVI-D)*[2],
- кабель відэасігналу (DisplayPort)*[3],
- кабель відэасігналу (міні-раздым DisplayPort — DisplayPort)*[4],
- USB-кабель,
- даведнік па ўсталяванні,
- кампакт-дыск*[3],
- шрубы (4 шт.), прымацоўваюць манітор да рухомага кранштэйн (старонка 10).




**ЗАЎВАГА.** Манітор можа быць абсталяваны дадатковаю прыладаю «MultiSync Soundbar Pro». Звярніцеся да прадаўца або наведайце наш сайт.

* Абавязкова захавайце скрыню і пакавальны матэрыял, каб манітор можна было перавозіць або перасылаць.

*[1] Від і колькасць укладзеных кабеляў сілкавання залежыць ад таго, адкуль адгружалі вадкакрышталёвы манітор. Калі ў камплекце пастаўкі некалькі кабеляў сілкавання, выкарыстоўвайце дазволены ў краіне кабель, які адпавядае напружанню электрасеткі і стандартам бяспекі вашай краіны.

*[2] Двухканальны кабель DVI для мадэляў PA272W і PA302W.

*[3] Толькі для мадэлі PA242W.

*[4] Від і колькасць укладзеных кабеляў залежаць ад таго, адкуль адгружалі вадкакрышталёвы манітор.

# Як пачаць карыстацца

Каб далучыць вадкакрышталёвы манітор да камп’ютара, зрабіце наступнае:

**ЗАЎВАГА.** Перад тым як усталёўваць, абавязкова прачытайце раздзел «Парады па выкарыстанні» (старонка 3). Для таго каб выява адлюстроўвалася з найбольшаю разрознасцю, відэакарта мусіць падтрымліваць разрознасць 2560 × 1440 (для мадэлі PA272W) або 2560 × 1600 (для мадэлі PA302W). Толькі для мадэлі PA302W: Усталёўваць або перамяшчаць манітор трэба прынамсі ўдвух.

1. Вылучыце сілкаванне камп’ютара.
2. **Камп’ютар (у тым ліку «MAC») з лічбавым DVI-выхадам:** далучыце сігнальны кабель DVI да раздыму відэакарткі камп’ютара (**малюнак A.1**). Зацягніце ўсе шрубы.

   **Камп’ютар з аналагавым выхадам (Толькі для мадэлі PA242W):** далучыце 15-кантактны сігнальны кабель (мініраздым D-SUB — DVI-A)да раздыму відэакарткі камп’ютара (**малюнак A.2**).

   **Камп’ютар «MAC» (Толькі для мадэлі PA242W):** далучыце пераходнік для «Макінтоша» (не ўваходзіць у камплект) да камп’ютара, потым далучыце 15-кантактны сігнальны кабель з міні-раздымам «D-SUB» да пераходніка (**малюнак A.3**).

**ЗАЎВАГА.** Не ўсім камп’ютарам «Макінтош» трэба адпаведны пераходнік.

   **Камп’ютары з выхадам «DisplayPort»:** далучыце кабель «DisplayPort» да раздыму відэакарткі камп’ютара (**малюнак A.4**).



Малюнак A.1



малюнак A.2





малюнак A.3





Малюнак A.4

**ЗАЎВАГА.** 1. Выкарыстоўвайце кабель DisplayPort з лагатыпам DisplayPort.
2. Каб выняць кабель DisplayPort, трымайце верхнюю кнопку, каб адамкнуць замок.

3. Кнопка замыкання не дае настаўляць вышыню. Вазьміцеся рукамі за верхнюю частку манітора і апусціце яго да найменшае вышыні. Каб адамкнуць, ссуньце кнопку замыкання (**малюнак Б.1**).

**ЗАЎВАГА.** Будзьце асцярожнымі, калі адмыкаеце стойку.

   Каб падняць вадкакрышталёвую панэль уверх, пакладзіце рукі абапал манітора, нахіліце панэль на 30-градусаў і пацягніце ўверх. Ссуньце ўверх накрыўку кабеляў (**малюнак Б.2**).

**ЗАЎВАГА.** Накрыўка кабеляў не здымаецца.





Малюнак Б.1





Малюнак Б.2

4. Далучыце ўсе кабелі ў адпаведныя раздымы (**малюнак B.1**). Калі выкарыстоўваецца USB-кабель, далучыце раздым віду «Б» да ўваходнага USB-порту на правым баку манітора, а раздым «А» — да выходнага порту камп’ютара (**малюнак B.1a**). Калі выкарыстоўваецца кабель ад USB-прылады, усуньце яго ў адзін з выходных портаў манітора.

**ЗАЎВАГА.** Калі няправільна злучыць кабелі, могуць быць збоі ў працы, можа пагоршыцца якасць выявы, а таксама могуць пашкодзіцца кампаненты вадкакрышталёвага дысплэя і (або) скароціцца тэрмін яго працы.




(Толькі для мадэлі PA242W) **Малюнак B.1** (PA272W і PA302W)




**Малюнак B.1a**

5. Каб акуратна захоўваць кабелі, размяшчайце іх у адмысловым латку, убудаваным у стойку. Раўнамерна ўмацуйце кабелі ў гапліках (**малюнак B.2** і **малюнак B.3**).
6. Пасля таго, як уставілі кабелі, паглядзіце, каб экран манітора можна было круціць, падымаць і апускаць.




(Толькі для мадэлі PA242W) **Малюнак B.2** (PA272W і PA302W)




(Толькі для мадэлі PA242W) **Малюнак B.3** (PA272W і PA302W)

*1: Кабель у камплект не ўваходзіць.
*2: Для ўнутранай каліброўкі далучыце датчыка да гэтага порта (толькі для мадэлі PA302W).

7. Ссуньце ўніз накрыўку кабеляў (**малюнак Г.1**).
8. Далучыце адзін канец кабелю сілкавання да раздыму сілкавання на задняй панэлі манітора, а другі канец — да разеткі.

**ЗАЎВАГА.** Каб падабраць правільны кабель сілкавання, звярніцеся да раздзелу «Перасцярога».



**Малюнак Г.1**

9. Умыкніце кнопкаю сілкавання манітор (**малюнак Д.1**) і камп'ютар.
10. Калі манітор запускаецца першы раз, функцыя «Наладзіць без дотыку» аўтаматычна настаўляе найлепшыя налады (для большасці параметраў сінхранізацыі). Каб потым самастойна наставіць манітор, карыстайцеся наступнымі пунктамі экраннага меню:
    - AUTO CONTRAST (аўтакантраст; для аналагавага ўваходу)*,
    - AUTO ADJUST (аўтанастаўленне; для аналагавага ўваходу)*,

    Поўнае апісанне пунктаў экраннага меню — у раздзеле «**Кіраванне**» даведніка.

**ЗАЎВАГА.** Калі з'явіліся непаладкі, звярніцеся да раздзелу **Пошук непаладак** даведніка.




**Малюнак Д.1**

## Вышыня экрана манітора

Падымаць і апускаць манітор можна як у кніжнай паставе, так і ў альбомнай.
Каб падняць або апусціць экран, вазьміцеся рукамі абапал манітора і падыміце або апусціце яго на неабходную вышыню (**малюнак ПА.1**).

**ЗАЎВАГА.** Будзьце асцярожнымі, калі падымаеце або апускаеце экран манітора.



**Малюнак ПА.1**

* Толькі для мадэлі PA242W.

## Альбомная і кніжная арыентацыі

Перад тым як змяняць паставу манітора, падыміце экран на сама высокі ўзровень і як мага болей нахіліце яго, каб ён не ўпаў на стол і каб вам не заціснула пальцы. Адлучыце ўсе кабелі.
Каб падняць экран, вазьміцеся рукамі абапал манітора і падыміце яго да найбольшае вышыні (**малюнак ПА.1**).
Каб павярнуць экран, вазьміцеся рукамі абапал манітора і павярніце яго па сонцы з альбомнай паставы ў кніжную, або супраць сонца — з кніжнай у альбомную (**малюнак П.1**).
Каб павярнуць экраннае меню з альбомнай паставы ў кніжную (і наадварот), звярніцеся да раздзелу «Кіраванне».



**Малюнак П.1**

## Нахіл

Вазьміцеся за верхні і ніжні бок экрана манітора, і настаўце патрэбны вугал нахілу (**малюнак НП.1**).



**Малюнак НП.1**

**ЗАЎВАГА.** Будзьце асцярожнымі, калі нахіляеце экран манітора.

## Паварот

Вазьміцеся абапал экрана манітора і настаўце патрэбны вугал павароту вакол вертыкальнае восі (**малюнак НП.2**).



**Малюнак НП.2**

# Усталяванне рухомага кранштэйна

Гэты вадкакрышталёвы манітор можна ўсталёўваць на рухомы кранштэйн.

Каб падрыхтаваць манітор да іншага спосабу ўсталявання, зрабіце наступнае:

**ЗАЎВАГА.** Усталёўваць або перамяшчаць манітор мадэлі PA302W трэба прынамсі ўдвух.

- Кіруйцеся ўказаннямі вытворцы кранштэйна для дысплэя.
- Згодна з патрабаваннямі бяспекі, манітор трэба ўсталёўваць на кранштэйн, які вытрымлівае вагу манітора. Падрабязней гл. старонку 27-28-29. Перад усталяваннем здыміце стойку.

# Як зняць стойку перад усталяваннем

Каб падрыхтаваць манітор да іншага спосабу ўсталявання, зрабіце наступнае:

1. Адлучыце ўсе кабелі.
2. Вазьміцеся рукамі абапал манітора і падыміце яго да найбольшае вышыні.
3. Пакладзіце манітор на мяккую паверхню экранам уніз (**малюнак C.1**).
4. Пакладзіце адну руку на аснову, другую — на зашчапку.
   Націсніце і ўтрымлівайце зашчапку ў кірунку, паказаным стрэлкай (**малюнак C.1**).
5. Падыміце стойку, каб адлучыць яе ад манітора (**малюнак C.1**).
   Манітор можна ўсталяваць іншым спосабам.
   Каб прымацаваць стойку, рабіце ўсё ў адваротным парадку.

**ЗАЎВАГА.** Будзьце асцярожнымі, калі здымаеце стойку манітора.



**Малюнак C.1**

# Прымацоўванне на рухомы кранштэйн

Гэты вадкакрышталёвы манітор можна ўсталёўваць на рухомы кранштэйн.

1. Каб зняць стойку, кіруйцеся падказкамі раздзелу «Як зняць стойку перад усталяваннем».
2. Прымацуйце кранштэйн да манітора з дапамогаю чатырох шруб, знятых са стойкі (**малюнак P.1**).




**Малюнак P.1**

**Перасцярога:** каб не пашкодзіць манітор або стойку, выкарыстоўвайце ТОЛЬКІ шрубы ў камплекце (4 шт.), або шрубы M4 (даўжыня = таўшчыня кранштэйна і шайбы + 10–12 мм). Згодна з патрабаваннямі бяспекі, манітор трэба ўсталёўваць на кранштэйн, які забяспечвае неабходную ўстойлівасць з улікам вагі манітора. Вадкакрышталёвы манітор трэба выкарыстоўваць толькі з прызначаным для яго кранштэйнам (напрыклад, з адзнакаю «GS»).




**ЗАЎВАГА.** Зацягніце ўсе шрубы.
(рэкамендаваная сіла заціску: 98–137 Н·см)

# Кіраванне

## На пярэдняй панэлі ёсць наступныя кнопкі кіраваць экранным меню (OSD, англ. «On-Screen Display»):

Каб атрымаць доступ да экраннага меню, націсніце кнопку «MENU» (меню).
Каб змяніць крыніцу сігналу, націсніце кнопку «SELECT» (выбар).

**ЗАЎВАГА.** Каб змяніць крыніцу сігналу, трэба выйсці з меню.




| | |
|---|---|
| 1 Датчык асветленасці | Вызначае ўзровень асветленасці навакольля, што дазваляе манітору прыстасоўваць налады да розных умоў, каб карыстальніку было зручней працаваць. Не захіляйце гэты датчык. |
| 2 Сілкаванне | Умыкае і вымыкае манітор. |
| 3 Лямпачка | Паказвае, ці ўмыкнулі сілкаванне.<br>Колер можна змяняць (сіні або зялёны) у пашыраным экранным меню. |
| 4 INPUT/SELECT (уваход/выбар) | Адчыняе экраннае меню кіравання. Адчыняе ўкладзеныя пункты меню.<br>Змяняе крыніцу сігналу (калі не адчынілі экраннае меню кіравання).<br>Каб убачыць меню выбару USB, утрымлівайце кнопку калі вы не ў экранным меню*1.<br>ЗАЎВАГА. Гэтыя налады выбару USB вяртаюцца да абраных у экранным меню, калі змяняецца ўваходны сігнал або вымыкаецца манітор. |
| 5 MENU/EXIT (меню/выхад) | Адчыняе экраннае меню. Зачыняе ўкладзены пункт меню. Зачыняе экраннае меню кіравання. |
| 6 LEFT/RIGHT (улева/управа) | Дазваляюць пераходзіць улева і ўправа па экранным меню.<br>Дазваляюць наставіць яскравасць, не адчыняючы экраннае меню*1. |
| 7 UP/DOWN (уверх/уніз) | Дазваляюць пераходзіць уверх і ўніз па экранным меню.<br>Паказвае PICTURE MODE (рэжым выявы), калі вы не ў экранным меню*1, *2. |
| 8 RESET/PIP (скінуць/выява ў выяве) | У экранным меню кіравання вяртае экраннае меню да завадскіх наладаў.<br>PIP (выяву ў выяве) можна абраць, калі экраннае меню не адлюстроўваецца*3.<br>Націсніце гэтую кнопку, каб адлюстраваць «ECO MODE» (эканомія), калі экраннае меню не адчыненае*1. |
| 9 KEY GUIDE (падказкі) | Разам з пунктамі экраннага меню будуць з’яўляцца падказкі.<br>Падказкі будуць паварочвацца, калі паварочваецца экраннае меню*. |

* Кнопкі «улева», «управа», «уверх», «уніз» змяняюць сваё прызначэнне ў залежнасці ад арыентацыі (альбомная або кніжная) экраннага меню.

*1 Калі функцыя «ВЫКЛІЧНІКІ» (англ. «HotKey») забароненая, гэта не працуе.

*2 Меню «PICTURE MODE» (рэжым выявы).
Каб абраць рэжым выявы, націсніце кнопку «уверх» або «уніз». У рэжыме «PIP» (выява ў выяве) або «PICTURE BY PICTURE» (выява побач з выяваю), рэжым выявы можна абраць незалежна для галоўнага і дадатковага вокнаў, націснуўшы «улева» або «управа».



*3 Меню PIP MODE (ВЫЯВА Ў ВЫЯВЕ).
Каб вызначыць, ці адлюстроўваць дадатковае вакно, націсніце кнопку «уверх» або «уніз». Каб змяніць месцамі галоўнае і дадатковае вакно, націсніце кнопку «улева» або «управа».




## SETTING OSD LANGUAGE (мова экраннага меню)

- Увайдзіце ў меню «LANGUAGE SELECTION» (выбар мовы) з дапамогаю кнопак кіравання (уверх-уніз, улева-управа, кнопка меню).
- Каб абраць мову экраннага меню, націсніце кнопкі «уверх-уніз» або «улева-управа».
- Каб выйсці з гэтага меню, націсніце кнопку «EXIT» (выхад).

**ЗАЎВАГА.** Вызначаць мову экраннага меню трэба толькі адзін раз. Абраная мова будзе дзейнічаць, пакуль карыстальнік яе не зменіць.



# Кіраванне яскравасцю і кантрастам

## BRIGHTNESS (яскравасць)

Настаўляе агульную яскравасць выявы і фону.

**ЗАЎВАГА.** Узровень яскравасці настаўляецца з дапамогаю падсветкі.
Дысплэй лічбавым шляхам ураўноўвае нізкі або высокі ўзровень яскравасці.
Калі гэта адбываецца, значэнне яскравасці ў экранным меню зменіць колер на чырвоны.

**ЗАЎВАГА.** Найлепшая якасць выявы будзе ў прамежку, дзе значэнне яскравасці экраннага меню будзе чорным. Калі манітор не можа дасягнуць патрэбнага ўзроўню яскравасці, лікавае значэнне яскравасці ў меню будзе мігцець.

**ЗАЎВАГА.** Каб дасягнуць нізкага ўзроўню яскравасці, дысплэй будзе аўтаматычна змяняць кантраснасць экрана. Кантраснасць паменшыцца, а паказальнік экраннага меню змяніць колер на чырвоны.

**ЗАЎВАГА.** Каб дасягнуць высокага ўзроўню яскравасці, дысплэй будзе аўтаматычна памяншаць ураўноўванне аднароднасці. Паказальнік экраннага меню змяніць колер на чырвоны, і ў выніку можа пагоршыцца аднароднасць.

## CONTRAST (кантраст; для аналагавага ўваходу)*

Настаўляе агульную яскравасць выявы і фону згодна з узроўнем уваходнага сігналу.

**ЗАЎВАГА.** Каб паменшыць спажыванне электраэнергіі і палепшыць якасць выявы, раіцца настаўляць яскравасць з дапамогаю адпаведнае «BRIGHTNESS» (яскравасць).

## ECO MODE (эканомія)

Памяншае ўзровень яскравасці, каб паменшыць энергаспажыванне.

**OFF (не дзейнічае):** нічога не робіць.

**MODE1 (рэжым 1):** памяншае найбольшую магчымую яскравасць да прыблізна 200 кд/м$^2$.

**MODE2 (рэжым 2):** памяншае найбольшую магчымую яскравасць да прыблізна 100 кд/м$^2$.

## BLACK (чорны)

Настаўляе яскравасць чорнага.
Калі абраныя налады — занадта нізкія, каб можна было адлюстраваць, паказальнік у экранным меню зменіць колер на чырвоны.




# Аўтанастаўленне (для аналагавага ўваходу)*

## AUTO ADJUST (аўтанастаўленне)

Аўтаматычна настаўляецца размяшчэнне выявы, ШЫРЫНЯ і ВЫРАЗНАСЦЬ .

## AUTO CONTRAST (аўтакантраст)

Выпраўляе выявы, атрыманыя з нестандартных відэаўваходаў.



# Кіраваць выяваю

## LEFT / RIGHT (улева/управа)

Кіруе размяшчэннем выявы па гарызанталі на экране вадкакрышталёвага дысплэя.

## DOWN / UP (уверх/уніз)

Кіруе размяшчэннем выявы па вертыкалі на экране вадкакрышталёвага дысплэя.

## H.SIZE, V.SIZE (шырыня, вышыня; для аналагавага ўваходу)*

Выпраўляе шырыню выявы, павялічваючы або памяншаючы гэтае значэнне.

Калі функцыя «AUTO ADJUST»(аўтанастаўленне) не дала патрэбнага выніку, далей можна наладжваць з дапамогаю функцыі «ШЫРЫНЯ (або ВЫШЫНЯ)» (сінхранізацыя). Для гэтага можна ўжываць муаравы ўзор. У выніку можа змяніцца шырыня выявы. Змясціць выяву ў сярэдзіне экрана можна кнопкамі «улева» і «управа». Калі ШЫРЫНЯ (або ВЫШЫНЯ) наставілася дрэнна, у выніку выява можа выглядаць, як на левым малюнку. Але выява мусіць быць аднароднаю.



Калі значэнне H.SIZE (шырыня) памылковае. | Калі значэнне H.SIZE (шырыня) палепшанае. | Калі значэнне H.SIZE (шырыня) правільнае.

* Толькі для мадэлі PA242W.

## FINE (выразнасць; для аналагавага ўваходу)*

Паляпшае фокус, выразнасць і ўстойлівасць выявы, павялічваючы або памяншаючы гэтае значэнне.

Калі функцыя «AUTO ADJUST (АЎТАНАСТАЎЛЕННЕ)» і функцыя «ШЫРЫНЯ» (шырыня) не далі патрэбнага выніку, далей можна наладжваць з дапамогаю функцыі «FINE» (выразнасць).

Для гэтага можна ўжываць муаравы ўзор. Калі значэнне функцыі « FINE» наставілася дрэнна, у выніку выява можа выглядаць, як на левым малюнку. Але выява мусіць быць аднароднаю.



Калі значэнне FINE (выразнасць) памылковае.

Калі значэнне FINE (выразнасць) правільнае.

## AUTO FINE (аўтавыразнасць; для аналагавага ўваходу)*

Функцыя перыядычна настаўляе выразнасць, каб адпавядаць стану сігналу.
Функцыя настаўляецца прыкладна кожныя 33 хвіліны.

## EXPANSION (павелічэнне)

Вызначае спосаб, якім павялічваецца выява.

**FULL (увесь экран):** выява расцягваецца на ўвесь экран, незалежна ад разрознасці.

**ASPECT (суадносіны бакоў):** выява расцягваецца, але суадносіны бакоў захоўваюцца.

**OFF (не дзейнічае):** выява не павялічваецца.

**CUSTOM (самастойна):** поўнае апісанне шукайце ў раздзеле «Дадатковыя магчымасці меню».

## SHARPNESS (рэзкасць)

Лічбавая функцыя, якая дазваляе заўжды захоўваць чытальнасць выявы. Каб атрымаць выразную або мяккую выяву, рэзкасць плаўна змяняецца і не залежыць ад параметраў сінхранізацыі.

# Сістэмы кіравання колерам

## PICTURE MODE (рэжым выявы)

Дазваляе змяняць рэжым выявы на той, што болей адпавядае змесціву, якое адлюстроўвае дысплэй. Ёсць пяць рэжымаў. Падрабязней — у раздзеле «Пашыранае меню», метка 1, частка «PICTURE MODE» (рэжым выявы) — старонка 18, і ў раздзеле «Функцыя „PICTURE MODE“ (рэжым выявы)», старонка 17.

## WHITE (белы)

Наставіць тэмпературу белага можна або на значэнне «NATIVE» (стандартная), або павялічыць ці паменшыць да патрэбнага значэння. Нізкая тэмпература колераў зробіць выяву на экране чырванаватаю, а высокая — сінявataю. Значэнне «NATIVE» адпавядае прадвызначанай тэмпературы колераў вадкакрышталёвага дысплэя. Тэмпература 6500 K раіцца для звычайнай працы з графікай, а 5000 K варта ўжываць дзеля лепшай адпаведнасці друку.

## ADJUST (наставіць)

**HUE (адценне):** настаўляе адценне кожнага колеру*[1]. Змяненне колераў адлюструецца на экране, а велічыня паказваецца палосамі ў меню.

**OFFSET (зрух):** настаўляе яскравасць кожнага колеру*[1]. Каб павялічыць яскравасць, націсніце кнопку «управа».

**SATURATION (насычанасць):** настаўляе глыбіню кожнага колеру*[1]. Каб павялічыць глыбіню, націсніце кнопку «управа».

**WHITE (баланс белага):** Калі трэба дадаткова наставіць тэмпературу колераў, можна змяніць асобна ўзроўні чырвонага, зялёнага і сіняга колераў у пункце белага. Каб змяняць узроўні асобных колераў, значэнне «TEMPERATURE» (тэмпература) трэба ўсталяваць у «CUSTOM» (самастойна).

## ADVANCED SETTING (пашыраныя налады)

Паказвае меню пашыраных наладаў. Падрабязней гл. старонку 18. Дакладней наставіць «PICTURE MODE» (рэжым выявы)можна ў меню пашыраных наладаў, метка 1.

* Толькі для мадэлі PA242W.
*[1]: RED (чырвоны), YELLOW (жоўты), GREEN (зялёны), CYAN (блакітны), BLUE (сіні) і MAGENTA (пурпуровы).

# Інструменты

## PIP MODE (рэжымы «выява ў выяве»)

Дазваляе абраць PIP MODE (рэжым «выявы ў выяве»), OFF/PIP/PICTURE BY PICTURE — ASPECT/PICTURE BY PICTURE — FULL (не дзейнічае/выява ў выяве/выява побач з выяваю — суадносіны/выява побач з выяваю — на ўвесь экран). Рэжым выявы можна абіраць на кожным экране.
Дысплэй можа адлюстроўваць два ўваходы адначасова.




MAIN IMAGE ROTATION ON / SUB IMAGE ROTATION: ON
(паварочваць галоўную выяву: так / паварочваць другую выяву: не)




## PIP INPUT (уваход для «выявы ў выяве»)

Абірае ўваходны сігнал рэжыму «выява ў выяве».

## PIP LEFT/RIGHT (выява злева або справа)

Вызначае размяшчэнне другой выявы па гарызанталі адносна першай выявы ў рэжыме «выява ў выяве».

## PIP DOWN/UP (выява зверху або знізу)

Вызначае размяшчэнне другой выявы па вертыкалі адносна першай выявы ў рэжыме «выява ў выяве».

## PIP SIZE (памер другой выявы)

Вызначае памер дадатковае выявы ў рэжыме «выява ў выяве».

## USB SELECTION (выбар USB)

Змяняе ўваход USB (1 або 2), звязаны з дзейным уваходам дысплэя. Калі да кожнага з уваходных портаў далучаны камп'ютар, можна ўжываць выходныя USB-порты манітора: дастаткова абраць іх на ўваходны сігнал.
Змяніць порт спалучэнне USB-порту адлюстравання і ўваходнага USB-порту можна з дапамогаю кнопкі «INPUT» (гл. старонку 11).
Выбар USB для кожнага сігналу можна наставіць у пашыраным меню (гл. старонку 22).
Калі ўжываецца толькі адзін уваходны порт, будзе выкарыстоўвацца далучаны ўваходны порт.

**ЗАЎВАГА.** Каб не страціць дадзеныя, перад тым як змяняць уваходны порт USB, упэўніцеся, ніводная з прылад USB-сховішча не выкарыстоўваецца аперацыйнай сістэмай камп'ютара, злучанага з уваходным USB-портам.

## VIDEO DETECT (выбар відэакрыніцы)

Вызначае спосаб, якім будзе абірацца відэа, калі далучылі некалькі крыніц відэа.

**FIRST (першая):** калі бягучага ўваходнага відэасігналу няма, манітор пачынае шукаць відэасігнал ад іншага порту відэаўваходу. Калі відэасігнал прысутнічае на іншым порце, тады манітор аўтаматычна пераходзіць на порт знойдзенай відэакрыніцы. Манітор не будзе шукаць іншыя відэасігналы, калі бягучая крыніца відэасігналу прысутнічае.

**LAST (апошняя):** калі ў той час, як манітор адлюстроўвае сігнал бягучай крыніцы, да яго далучыць другую крыніцу, манітор аўтаматычна пяройдзе на новую крыніцу відэасігналу. Калі бягучага ўваходнага відэасігналу няма, манітор пачынае шукаць відэасігнал ад іншага порту відэаўваходу. Калі відэасігнал прысутнічае на іншым порце, тады манітор аўтаматычна пераходзіць на порт знойдзенай відэакрыніцы.

**NONE (нічога):** манітор не будзе шукаць іншы порт відэаўваходу, апроч выпадку, калі манітор толькі што ўмыкнулі.

## OFF TIMER (таймер)

Манітор аўтаматычна вымыкаецца праз вызначаны загадзя час.
Перад тым, як манітор вымкнецца, на экране з'явіцца паведамленне з пытаннем, ці не жадаеце вы адкласці вымыканне на 60 хвілін. Каб адкласці вымыканне, націсніце на кнопку экраннага меню.

[*1] PA272W/PA302W: Дадатковае вакно з уваходаў DisplayPort або DVI адлюстроўваецца толькі на левай палове дысплэя.
Дадатковае вакно з уваходаў HDMI або міні-DisplayPort адлюстроўваецца толькі на правай палове дысплэя.

[*2] PA272W/PA302W: Калі крыніца галоўнага вакна — міні-DisplayPort або HDMI, нельга абраць функцыю «PICTURE BY PICTURE - ASPECT» (або FULL).
Калі вызначылі параметр PICTURE BY PICTURE - ASPECT (або FULL), нельга змяніць уваход галоўнага экрана на міні-DisplayPort або HDMI.
Калі выкарыстоўваецца сігнал DisplayPort (або DVI) і функцыя PICTURE BY PICTURE - ASPECT (або FULL), прызначайце галоўнаму вакну ўваход DisplayPort або DVI.

Налады імітацыі друку або параметр «6 - AXIS ADJUST» (6-восевае настаўленне) праграмы «MultiProfiler» у залежнасці ад умоў могуць даваць наступныя вынікі.

[*3] Наладжваецца толькі адзін экран: налады адлюстроўваюцца на адпаведным вакне (галоўным або дадатковым).
Аднолькавыя налады абодвух экранаў: налады адлюстроўваюцца і ў галоўным, і ў дадатковым акне.

[*4] Асобныя налады кожнага экрана: налады адлюстроўваюцца толькі ў галоўным акне. На экране з'явіцца папярэджанне (6-AXIS SUB:OFF).

[*5] Асобныя налады кожнага экрана: налады адлюстроўваюцца толькі ў галоўным акне. На экране з'явіцца папярэджанне: «6-AXIS SUB:OFF» (толькі для мадэлі PA242W).

[*6] Наладжваецца толькі адзін экран: налады адлюстроўваюцца на адпаведным вакне (галоўным або дадатковым).
Аднолькавыя налады абодвух экранаў: налады адлюстроўваюцца і ў галоўным, і ў дадатковым акне (толькі для мадэлі PA242W).

## OFF MODE (вымыканне)

Інтэлектуальны кіраўнік сілкавання дазваляе манітору пераходзіць у стан эканоміі энергіі пасля пэўнага часу бяздзейнасці.

У налады вымыкання ўваходзяць чатыры пункты.

**OFF (не дзейнічае):** калі знікае ўваходны сігнал, манітор не пераходзіць у стан эканоміі энергіі.

**STANDARD (стандартна):** манітор пераходзіць у стан эканоміі энергіі, калі знікае ўваходны сігнал.

**ADVANCED (пашырана):** схема выяўлення сігналу заўжды працуе. Манітор вяртаецца ў звычайны стан хутчэй, чым калі абраць «STANDARD» (стандартна), але энергіі спажываецца крыху болей.

**ЗАЎВАГА.** Калі абралі «STANDARD», але выява не адлюстроўваецца, калі вяртаецца крыніца сігналу, трэба абраць пункт «ADVANCED».

**OPTION (альтэрнатыўна):** манітор пераходзіць у стан эканоміі энергіі, калі ўзровень навакольнага асвятлення падае да вызначанага карыстальнікам значэння. Гэта ўзровень настаўляецца ў раздзеле «Пашыранае меню», метка 6, частка «OFF MODE SETTING» (налады вымыкання).

У стане эканоміі энергіі лямпачка на пярэдняй панэлі мігціць жоўтым колерам. Каб вярнуць манітор у звычайны стан, трэба націснуць на пярэдняй панэлі любую кнопку, апроч кнопак сілкавання і «SELECT» (выбар).

Калі навакольнае асвятленне вяртаецца да звычайнага ўзроўню, манітор вяртаецца ў звычайны стан.




# MENU TOOLS (інструменты меню)

## LANGUAGE (мова)

Экраннае меню можа адлюстроўвацца на дзевяці мовах.

## OSD LEFT/RIGHT (меню злева або справа)

Дазваляе вызначыць, дзе трэба адлюстроўваць экраннае меню. Карыстальнік мае магчымасць самастойна вызначыць, справа ці злева размяшчаць экраннае меню.

## OSD DOWN/UP (меню ўнізе або ўверсе)

Дазваляе вызначыць, дзе трэба адлюстроўваць экраннае меню. Карыстальнік мае магчымасць самастойна вызначыць, зверху ці знізу размяшчаць экраннае меню.

## OSD TURN OFF (таймер меню)

Экраннае меню будзе адлюстроўвацца, пакуль яно выкарыстоўваецца. Можна абраць, як доўга манітор будзе чакаць пасля апошняга націску на кнопку, перад тым як вымкнуць экраннае меню. Зададзеныя значэнні: ад 10 да 120 секунд з крокам у 5 секунд.

## OSD LOCK OUT (замкнуць меню)

Дазваляе цалкам зачыніць доступ да ўсіх функцый экраннага меню. Калі паспрабаваць абраць загады экраннага меню, калі яго замкнулі, з'явіцца паведамленне, якое пакажа, што пункты меню замкнёныя.

Ёсць чатыры спосабы замыкаць меню:

Замкнуць усе пункты меню: каб задзейнічаць функцыю «Замкнуць меню», націсніце і не адпускайце кнопку «SELECT» (выбар), потым націсніце «управа» і трымайце абедзве кнопкі націснутымі. Каб адамкнуць меню, націсніце і не адпускайце «SELECT», потым націсніце «управа» і трымайце абедзве кнопкі націснутымі, пакуль меню не з'явіцца. У замкнёным меню нельга абраць ніводнага пункту.

Замкнуць і пакінуць магчымасць кіраваць толькі яскравасцю: каб замкнуць меню, націсніце і не адпускайце «SELECT», потым націсніце кнопкі «уніз», «улева» і трымайце ўсе кнопкі націснутымі. Каб адамкнуць меню, націсніце і не адпускайце «SELECT», потым націсніце «уніз», «улева» і трымайце ўсе кнопкі націснутымі, пакуль меню не з'явіцца. У замкнёным такім чынам меню можна настаўляць яскравасць.

CUSTOM (самастойна): пераход да пашыранага меню.

## OSD TRANSPARENCY (празрыстасць меню)

Настаўляе празрыстасць экраннага меню.

## OSD COLOR (колер меню)

Настаўляе колер экраннага меню. «Tag window frame color» (рамка вакна меткі), «Item select color» (абраны пункт) і «Adjust window frame color» (рамка вакна настаўлення) могуць быць чырвонага, зялёнага, сіняга або шэрага колеру.

## RESOLUTION NOTIFIER (паведамленне пра разрознасць)

Калі абраць «ON», на працягу 30 секунд будзе адлюстроўвацца папярэджанне пра тое, што разрознасць не роўная 1920 × 1200 — для мадэлі PA242W, 2560 × 1440 — для мадэлі PA272W, 2560 × 1600 — для мадэлі PA302W.

## HOT KEY (выклічнікі)

Значэнне ЯСКРАВАСЦІ можна настаўляць непасрэдна. Калі ўсталяваць значэнне «ON», можна будзе настаўляць яскравасць кнопкамі «улева» і «управа», не адчыняючы экраннае меню. У звычайнае меню можна зайсці, націснуўшы кнопку «EXIT» (выхад). Калі ўсталяваць значэнне «OFF», пэўныя кнопкі не будуць дзейнічаць (гл. старонку 11).

### FACTORY PRESET (завадскія налады)

Калі абраць пункт «FACTORY PRESET» (завадскія налады), гэта дазволіць скінуць да завадскіх значэнняў усе налады экраннага меню (яскравасць, кантраст*[1], рэжым эканоміі, чорны колер, кіраванне выяваю, сістэму кіраваць колерам, рэзкасць, рэжым, уваход, размяшчэнне і памер выявы ў выяве, выбар USB, таймер, вымыканне, размяшчэнне меню, таймер і празрыстасць меню). Асобныя налады можна скінуць, калі абраць патрэбны пункт меню і націснуць кнопку «RESET» (скінуць).

**ЗАЎВАГА.** Калі трэба скінуць у тым ліку і налады каліброўкі выявы і «SELF COLOR CORRECTION) (аўтавыпраўленне колеру), выкарыстоўвайце пункт «FACTORY PRESET» (завадскія налады) у пашыраным меню (гл. старонку 24).

## ЗВЕСТКІ ПРА ЭКАНОМІЮ

**CARBON SAVINGS (зберагання вугляроду):** ацэньвае, колькі зберaглі вугляроду (у кілаграмах).

**CARBON USAGE (выкарыстанне вугляроду):** ацэньвае, колькі выкарысталі вугляроду (у кілаграмах).
Гэта арыфметычная ацэнка, а не сапраўднае значэнне.
Гэтая ацэнка не мае наладаў.

**COST SAVINGS (эканомія):** паказвае эканомію электраэнергіі ў балансе.

**CARBON CONVERT SETTING (падлік вугляроду):** настаўляе множнік вугляроднага следу ў падліках зберагання вугляроду. Пачатковыя налады грунтуюцца на дадзеных Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (OECD)за 2008 год.

**CURRENCY SETTING (грашовыя налады):** паказвае кошт электраэнергіі ў 6 грашовых адзінках.

**CURRENCY CONVERT SETTING (ТАРЫФ):** паказвае эканомію электраэнергіі ў кВт·гадз (прадвызначаная адзінка — валюта ЗША).

**ЗАЎВАГА.** Пачатковыя налады мадэлі наступныя: грашовая адзінка — $ (долар ЗША)», а тарыф — 0,11 $.
Гэтыя значэнні можна змяніць у меню звестак пра эканомію.
Каб выкарыстоўваць налады для Францыі, зрабіце наступнае:

1. Націсніце кнопку меню і з дапамогаю кнопак «управа» і «улева» абярыце меню звестак пра эканомію.
2. Абярыце CURRENCY SETTING (грашовыя налады), націснуўшы кнопкі «уверх» або «уніз».
3. Грашовая адзінка для Францыі — еўра (€). Можна наставіць грашовую адзінку на значок еўра (€) замест долара ЗША ($), націснуўшы кнопку «улева» або «управа» у пункце меню грашовых наладаў.
4. Абярыце пункт « CURRENCY CONVERT SETTING (ТАРЫФ)» кнопкамі «уверх» або «уніз».
   Пачатковыя налады еўра (€) — для Германіі, адпавядаюць дадзеным АЭСР (OECD) 2007 году.
   Праверце атрыманыя кошты на электраэнергію ўва Францыі або дадзеныя АЭСР для Францыі.
   Дадзеныя АЭСР (OECD) для Францыі (2007 год) — 0,12 €.
5. Настаўце CURRENCY CONVERT SETTING (ТАРЫФ) кнопкамі «улева» або «управа».

## Звесткі

Інфармацыя пра дзейную разрознасць дысплэя (галоўная выява), налады ўваходу USB і тэхнічныя дадзеныя, у тым ліку: сінхранізацыя, частата гарызантальнай і вертыкальнай разгорткі. Адлюстроўвае мадэль і серыйны нумар манітора.

# Папярэджанне экраннага меню

Папярэджанні ў экранным меню знікаюць, калі націснуць кнопку «EXIT (выхад).

**NO SIGNAL (няма сігналу):** адлюстроўвае папярэджанне, калі няма гарызантальнай або вертыкальнай разгорткі. Вакно **NO SIGNAL (няма сігналу)**, з'яўляецца, калі ўмыкнуць сілкаванне або змяніць уваход сігналу.

**RESOLUTION NOTIFIER (паведамленне пра разрознасць):** папярэджвае, калі выкарыстоўваецца не найлепшая разрознасць. Вакно **RESOLUTION NOTIFIER (паведамленне пра разрознасць)** з'яўляецца, калі ўмыкнуць сілкаванне, змяніць уваход сігналу, або калі сігнал мае неадпаведную разрознасць. Гэтую функцыю можна забараніць у «Інструментах меню».

**OUT OF RANGE (Па-за дыяпазонам):** выдае парады па выкарыстанні лепшае разрознасці і частаты абнаўлення. Вакно **OUT OF RANGE (Па-за дыяпазонам)** з'яўляецца пасля таго як умыкнулі сілкаванне або змяніўся ўваходны сігнал, ці калі відэасігнал не мае правільнае сінхранізацыі.

**INTERLACED SIGNALS ARE NOT SUPPORTED (празрадковыя сігналы не падтрымліваюцца):** адлюстроўвае папярэджанне, калі выкарыстоўваецца празрадковы сігнал. Калі выяву бачна, змяніце разгортку сігналу прылады з празрадковай на прагрэсіўную (не празрадковую).
Падрабязней — у раздзеле «Пошук непаладак», частка «Няма выявы».

Падрабязнасці пунктаў меню можна знайсці ў пашыраным меню.

*[1]: Толькі для мадэлі PA242W.

# Функцыя PICTURE MODE (рэжым выявы)

Дазваляе змяняць Picture Mode (рэжым выявы) на той, што болей адпавядае змесціву, якое адлюстроўвае дысплэй. Ёсць некалькі відаў (sRGB, Adobe®RGB, DCI, REC-Bt709, HIGH BRIGHT — высокая яскравасць, FULL — поўная, DICOM, PROGRAMMABLE — дапасавана).

- Кожны рэжым выявы ўлучае наступныя налады: BRIGHTNESS (яскравасць), AUTO BRIGHTNESS (аўтаяскравасць), WHITE (белы), гама колераў, GAMMA (гама), BLACK (чорны) UNIFORMITY (аднароднасць), COLOR VISION EMU (імітацыя каляровага зроку), METAMERISM (метамерыя) RESPONSE IMPROVE (лепшы водгук), AMBIENT LIGHT COMP. (ураўноўванне навакольнага святла), 6-восевае настаўленне. Гэтыя налады можна змяніць у пашыраным меню, метка 1.







**Загадзя вызначаныя наборы**

| НАБОР | ПРЫЗНАЧЭННЕ |
|---|---|
| **sRGB** | Стандартная каляровая прастора, якая выкарыстоўваецца для інтэрнэта, аперацыйных сістэм «Windows» і лічбавых камер. Раіцца для агульнага кіравання колерам. |
| **Adobe®RGB** | Завадскія налады. Стандартная каляровая прастора, якая выкарыстоўваецца ў прафесійным выкарыстанні графікі: прафесійных лічбавых камерах і іншым. |
| **eciRGB_v2** | Профіль каляровае прасторы, які раіць Еўрапейская ініцыятыва па колерах (ECI, англ. «The European Color Initiative»). |
| **DCI** | Налады колеру для лічбавага кіно. |
| **REC-Bt709** | Налады колеру для тэлебачання высокага разрознення. |
| **HIGH BRIGHT (высокая яскравасць)** | Налады найвышэйшага ўзроўню яскравасці. |
| **FULL (поўная)** | Натуральная каляровая гама дысплэя. Прыдатная для выкарыстання ў праграмах кіравання колерам. Ужывайце каляровы профіль ICC, які пастаўляецца на кампакт-дыску. |
| **DICOM** | Медыцынскія налады для прагляду рэнтгенаўскіх здымкаў. Налады, якія адпавядаюць стандарту DICOM для функцыі адлюстравання стандартных адценняў шэрага. |
| **PROGRAMMABLE (дапасавана)** | Для праграмы «MultiProfiler» або для наладаў каліброўкі абсталявання з набору праграм ад «NEC Display Solutions» (некаторыя налады экраннага меню не дзейнічаюць). |

**ЗАЎВАГА.**
- Калі абраны рэжым выявы адрозніваецца ад профілю колераў ICC камп'ютара, колеры могуць перадавацца недакладна.
- Каб мець магчымасць пашыранага кіравання колерам (імітацыя профілю ICC і друку), настойліва раіцца выкарыстоўваць праграму «MultiProfiler», распрацаваную таварыствам «NEC Display Solutions». Апошнія версіі праграмы «MultiProfiler» можна знайсці на вэб-сайце таварыства «NEC Display Solutions».
- Калі функцыя рэжымаў выявы забароненая, на экране з'яўляецца паведамленне «PICTURE MODE IS LOCKED». Каб задзейнічаць гэтую функцыю, націсніце разам кнопкі «SELECT» (выбар) і «уверх».

# Пашыранае меню

Падрабязнасці пунктаў меню можна знайсці ў пашыраным меню.
Увайсці ў пашыранае меню можна двума спосабамі.

**Спосаб першы:**

**<Каб увайсці ў пашыранае меню>**

- Каб адчыніць экраннае меню, націсніце кнопку меню. Кнопкамі пярэдняе панэлі перайдзіце ў раздзел ADVANCED SETTING (пашыраныя налады) пункту сістэм кіравання колерам. Націсніце кнопку «INPUT» (уваход), каб адчыніць пашыранае меню.

**<Каб выйсці з пашыранага меню>**

- Націсніце кнопку «EXIT» (выхад).

**Спосаб другі:**

**<Каб увайсці ў пашыранае меню>**

- Вымкніце манітор.
- Умыкніце манітор: націсніце адначасова кнопку сілкавання і кнопку «INPUT/SELECT» (уваход/выбар) і трымайце іх прынамсі адну секунду. Потым націсніце кнопку кіравання (EXIT (выхад), улева, управа, уверх або ўніз).
- З’явіцца пашыранае меню.
  Гэтае меню большае за звычайнае.

**<Каб выйсці з пашыранага меню>**

- Вымкніце і зноўку ўмыкніце манітор.

Каб наставіць значэнне, упэўніцеся, што вылучылі патрэбную метку і націсніце «SELECT» (выбар).

Каб перайсці да іншае меткі, вылучыце яе: націсніце «EXIT» (выхад), потым «улева» або «управа».

<table>
<tr><td rowspan="4">Метка 1</td><td>PICTURE MODE<br>(рэжым выявы)</td><td>Абірае рэжым выявы: ад 1 да 5.</td></tr>
<tr><td>PRESET (набор)</td><td>Усталёўвае рэжымам выявы адзін з набораў (гл. старонку 17).</td></tr>
<tr><td>BRIGHTNESS*2</td><td>Настаўляе агульную яскравасць выявы і экрана.<br>Каб наставіць, націсніце «улева» або «управа».</td></tr>
<tr><td>WHITE (белы)</td><td>Настаўляе тэмпературу белага колеру або налады па восях x—y. Нізкая тэмпература колераў зробіць выяву на экране чырванаватаю, а высокая — сіняватаю. Большыя значэнні «x» робіць экран чырванаватым, большыя значэнні «y» — зеленаватым, меншыя значэнні «x» і «y» робіць экран блакітна-белым.<br>
</td></tr>
</table>

*2 Гэты пункт не скідаецца да завадскіх наладаў (метка 7), калі значэнне AUTO BRIGHTNESS (АЎТАМАТЫЧНАЯ ЯСКРАВАСЦЬ) усталявалі ў «ON» (дзейнічае).

<table>
<tr>
<td></td>
<td>GAMMA (гама)</td>
<td>Дазваляе самастойна вызначыць узровень яскравасці адценняў шэрага. Ёсць пяць варыянтаў: sRGB, L Star, DICOM, PROGRAMMABLE (дапасавана) і CUSTOM (самастойна). Каб наладзіць гаму, раіцца адчыніць на экране чорна-белую выяву.<br>sRGB: Налады гамы для sRGB.<br>L Star: налады гамы для прастораў колераў «eciRGB_v2» і «Lab».<br>DICOM: DICOM GSDF (функцыя адлюстравання стандартных адценняў шэрага, англ. Grayscale Standard Display Function) звычайна выкарыстоўваецца для медыцынскіх выяў.<br>PROGRAMMABLE (дапасавана): вы можаце змяняць яскравасць адценняў шэрага па сваім жаданні, спампаваўшы адмысловую праграму. Гэта можна абраць, калі рэжым выявы — таксама «PROGRAMMABLE». Гэтую функцыю нельга абраць у пашыраным меню.<br>CUSTOM (самастойна): калі ў наладах гамы абраць «CUSTOM», можна самастойна задаваць значэнне «CUSTOM VALUE».<br>CUSTOM VALUE (сваё значэнне): значэнне гамы абіраецца ў прамежку ад 0,5 да 4,0 з крокам 0,1.<br></td>
</tr>
<tr>
<td></td>
<td>BLACK (чорны)</td>
<td>Настаўляе яскравасць чорнага. Калі абраныя налады — занадта нізкія, каб можна было адлюстраваць, паказальнік у экранным меню зменіць колер на чырвоны.</td>
</tr>
<tr>
<td></td>
<td>RED (чырвоны)<br>GREEN (зялёны)<br>BLUE (сіні)</td>
<td>Настаўляе гаму колераў. Калі абраныя налады выходзяць па-за межамі гамы дысплэя, паказальнік у меню зменіць колер на чырвоны.<br></td>
</tr>
<tr>
<td></td>
<td>COLOR VISION EMU (імітацыя недахопу каляровага зроку)</td>
<td>Паказвае розных віды недахопу зроку ў чалавека. Карысна, каб ацаніць, як будуць успрымаць колеры людзі, якія маюць такія недахопы. Сюды ўваходзяць чатыры рэжымы: віды «П» (протанапія, слепата на чырвоны), «Д» (дэйтанапія) і «Т» (трытанапія) імітуюць дыхраматычнасць каляровага зроку, а шэры можа выкарыстоўвацца для ацэнкі чытальнасці кантрасту.<br>ЗАЎВАГА. У залежнасці ад зроку карыстальнікаў, у тым ліку карыстальнікаў з недахопам каляровага зроку, колеры на экране будуць выглядаць і ўспрымацца па-рознаму.<br>Імітацыя дапамагае зразумець, як бачаць тыя, у каго недахоп каляровага зроку. Гэта не значыць, што яны так сапраўды бачаць. Мадэль адлюстроўвае каляровы зрок відаў «П», «Д» і «Т». Людзі з невялікім недахопам каляровага зроку практычна не заўважаць розніцы ў параўнанні з тымі, хто мае нармальны каляровы зрок.</td>
</tr>
</table>

| | | |
|---|---|---|
| | UNIFORMITY (аднароднасць) | Ураўноўвае нязначныя адхіленні ў аднароднасці белага, а таксама адхіленні ў колерах, якія могуць з'явіцца ў абсягу адлюстравання экрана. Такія адхіленні характэрныя для ўсіх дысплэяў на вадкіх крышталях. Гэта функцыя паляпшае колер і выраўноўвае аднароднасць яскравасці дысплэя.<br>ЗАЎВАГА. Функцыя «UNIFORMITY» (аднароднасць) памяншае агульную найбольшую яскравасць дысплэя. Калі яскравасць мае значэнне, большае за аднароднасць дысплэя, функцыю аднароднасці трэба вымкнуць. Большыя значэнні даюць лепшыя вынікі, але можа памяншацца кантраснасць. Калі «BRIGHTNESS» (яскравасць) адлюстроўваецца чырвоным, налады аднароднасці аўтаматычна памяншаюцца. |
| Метка 2 | SHARPNESS (РЭЗКАСЦЬ) | Лічбавая функцыя, якая дазваляе захоўваць чытальнасць выявы пры ўсіх тыпах сінхранізацыі сігналу. Каб атрымаць выразную або мяккую выяву, рэзкасць плаўна змяняецца і не залежыць ад параметраў сінхранізацыі. Каб наставіць, націсніце «улева» або «управа». |
| | RESPONSE IMPROVE (ЛЕПШЫ ВОДГУК) | Вызначае, ці паляпшаць водгук. Гэтая функцыя можа паменшыць размытасць, якую можна заўважыць у некаторых рухомых выявах. |
| | ECO MODE (эканомія) | Памяншае ўзровень яскравасці, каб паменшыць энергаспажыванне.<br>OFF (не дзейнічае): нічога не робіць.<br>MODE1 (рэжым 1): памяншае найбольшую магчымую яскравасць да прыблізна 200 кд/м$^2$.<br>MODE2 (рэжым 2): памяншае найбольшую магчымую яскравасць да прыблізна 100 кд/м$^2$. |
| | AUTO BRIGHTNESS (АЎТАМАТЫЧНАЯ ЯСКРАВАСЦЬ) | AUTO BRIGHTNESS (АЎТАМАТЫЧНАЯ ЯСКРАВАСЦЬ) можа мець два значэнні.<br>«OFF» (не дзейнічае) — раіцца, калі трэба атрымаць найлепшую перадачу колераў.<br>OFF (не дзейнічае): нічога не робіць.<br>ON (дзейнічае): Аўтаматычна настаўляе яскравасць: вызначае ўзровень асветленасці наваколля і настаўляе найлепшыя налады яскравасці.<br>Падрабязней пра аўтаматычную яскравасць — на старонцы 34.<br>Заўвага. Не захіляйце датчык АСВЕТЛЕНАСЦІ НАВАКОЛЛЯ. |
| | METAMERISM (метамерыя) | Паляпшае адпаведнасць пункту белага колеру, калі дысплэй выкарыстоўваецца поруч з маніторам стандартнае гамы. Гэта функцыя ўраўноўвае ўспрыманне чалавечым вокам, якое адрозніваецца ад тэхнічных інструментаў, якімі калібруюць дысплэй. |
| | AMBIENT LIGHT COMP. (ураўноўванне навакольнага святла) | Налады яскравасці залежаць ад ураўноўвання навакольнага асвятлення.<br>Болей за ўсё ўплывае на адлюстраванне чорнага колеру.<br>ЗАЎВАГА. Датчык аўтаматычнай яскравасці вымярае асветленасць, калі ёсць сілкаванне, і ўздзейнічае на выяву і налады якасці перадачы колераў.<br>ЗАЎВАГА. Не захіляйце датчык АСВЕТЛЕНАСЦІ НАВАКОЛЛЯ. |
| | (6 - AXIS ADJUST) (6-восевае настаўленне) | HUE (адценне): настаўляе адценне кожнага колеру*1. Змяненне колераў адлюструецца на экране, а велічыня паказваецца палосамі ў меню.<br>SATURATION (насычанасць): настаўляе глыбіню кожнага колеру*1. Каб павялічыць глыбіню, націсніце кнопку «управа».<br>OFFSET (зрух): настаўляе яскравасць кожнага колеру*1. Каб павялічыць яскравасць, націсніце кнопку «управа».<br>*1: RED (чырвоны), YELLOW (жоўты), GREEN (зялёны), CYAN (блакітны), BLUE (сіні) і MAGENTA (пурпуровы). |
| | SHORTCUT CUSTOM (бачныя рэжымы выявы) | Дазваляе абраць, якія рэжымы выявы будуць бачныя ў меню «PICTURE MODE» (рэжым выявы). |
| Метка 3 | R-H.POSITION* (размяшчэнне чырвонага; для аналагавага ўваходу) | Настаўляе размяшчэнне чырвонага складніка выявы.<br>Каб наставіць, націсніце «улева» або «управа». |
| | G-H.POSITION* (размяшчэнне зялёнага; для аналагавага ўваходу) | Настаўляе размяшчэнне зялёнага складніка выявы.<br>Каб наставіць, націсніце «улева» або «управа». |
| | B-H.POSITION* (размяшчэнне сіняга; для аналагавага ўваходу) | Настаўляе размяшчэнне сіняга складніка выявы.<br>Каб наставіць, націсніце «улева» або «управа». |
| | R-FINE* (выразнасць чырвонага; для аналагавага ўваходу) | Настаўляе значэнне «FINE» (выразнасць) чырвонага складніка выявы.<br>Каб наставіць, націсніце «улева» або «управа». |
| | G-FINE* (выразнасць зялёнага; для аналагавага ўваходу) | Настаўляе значэнне «FINE» (выразнасць) зялёнага складніка выявы.<br>Каб наставіць, націсніце «улева» або «управа». |
| | B-FINE* (выразнасць сіняга; для аналагавага ўваходу) | Настаўляе значэнне «FINE» (выразнасць) сіняга складніка выявы.<br>Каб наставіць, націсніце «улева» або «управа». |
| | R-SHARPNESS* (рэзкасць чырвонага; для аналагавага ўваходу) | Настаўляе рэзкасць чырвонага складніка выявы.<br>Каб наставіць, націсніце «улева» або «управа». |

* Толькі для мадэлі PA242W.

<table>
<tr><td></td><td>G-SHARPNESS*<br>(рэзкасць зялёнага; для аналагавага ўваходу)</td><td>Настаўляе рэзкасць зялёнага складніка выявы.<br>Каб наставіць, націсніце «улева» або «управа».</td></tr>
<tr><td></td><td>B-SHARPNESS*<br>(рэзкасць сіняга; для аналагавага ўваходу)</td><td>Настаўляе рэзкасць сіняга складніка выявы.<br>Каб наставіць, націсніце «улева» або «управа».</td></tr>
<tr><td></td><td>DIGITAL LONG CABLE<br>(доўгі лічбавы кабель; для ўваходаў DVI/HDMI)</td><td>Выпраўляе пагаршэнне выявы, выклiканае выкарыстаннем доўгага кабелю. Меншае значэнне выпраўляе слабей.</td></tr>
<tr><td></td><td>DIGITAL LONG CABLE<br>(доўгі лічбавы кабель; для ўваходаў DP і міні-DP*1)</td><td>Выпраўляе пагаршэнне выявы, выклiканае выкарыстаннем доўгага кабелю DisplayPort.<br>Можна абраць адно з 2 значэння (1 або 2).Значэнне «2» дае лепшы вынік, але можа пагоршыць колеры. Стандартнае значэнне — «1».</td></tr>
<tr><td>Метка 4</td><td>AUTO ADJUST*, *2<br>(АЎТАНАСТАЎЛЕННЕ)<br>(для аналагавага ўваходу)</td><td>Аўтаматычна настаўляецца размяшчэнне выявы, ШЫРЫНЯ і ВЫРАЗНАСЦЬ .<br>Каб задзейнічаць аўтаматычнае настаўленне, абярыце «SELECT». Ужывайце выпрабавальны шаблон, які пастаўляецца на кампакт-дыску.</td></tr>
<tr><td></td><td>SIGNAL ADJUST*<br>(настаўленне сігналу; для аналагавага ўваходу)</td><td>Вызначае, ці настаўляць аўтаматычна сігнал. Можна абраць «SIMPLE» (простае) або «FULL» (поўнае). Каб абраць, націсніце «улева» або «управа».
<table>
<tr><th></th><th>Шырыня, выразнасць, размяшчэнне</th><th>Кантраст</th></tr>
<tr><td>SIMPLE</td><td>O</td><td>X</td></tr>
<tr><td>FULL</td><td>O</td><td>O</td></tr>
</table>
O: Аўтаматычнае настаўленне X: Не настаўляецца аўтаматычна<br>ЗАЎВАГА. Аўтаматычнае настаўленне не працуе, калі разрознасць меншая за 800 × 600.</td></tr>
<tr><td></td><td>AUTO ADJUST LEVEL*<br>(узровень аўтанастаўлення; для аналагавага ўваходу)</td><td>Вызначае ўзровень аўтаматычнага наладжвання функцыі AUTO ADJUST (АЎТАНАСТАЎЛЕННЕ). Можна абраць: SIMPLE (просты), FULL (поўны), DETAIL (падрабязны). Каб абраць, націсніце «улева» або «управа». Глядзіце табліцу ўнізе.
<table>
<tr><th></th><th>Памер, выразнасць, размяшчэнне</th><th>Кантраст</th><th>Узровень чорнага</th><th>Час</th></tr>
<tr><td>SIMPLE</td><td>O</td><td>X</td><td>X</td><td>1 секунда</td></tr>
<tr><td>FULL</td><td>O</td><td>O</td><td>X</td><td>1,5 секунды</td></tr>
<tr><td>DETAIL*</td><td>O</td><td>O</td><td>O</td><td>5 секунд</td></tr>
</table>
O: Аўтаматычнае настаўленне X: Не настаўляецца аўтаматычна<br>* «DETAIL» (падрабязны) аўтаматычна ўраўноўвае хібы перадачы (зрух фазы, ВЧ-карэкцыя).</td></tr>
<tr><td></td><td>A-NTAA SW*<br>(пашыранае аўтанастаўленне; для аналагавага ўваходу)</td><td>Функцыя пашыранага аўтанастаўлення без дотыку (англ. «Advanced No Touch Auto Adjust») можна выяўляць новыя сігналы нават тады, калі не змянілася ані разрознненне, ані частата абнаўлення. Калі да манітора далучылі камп’ютараў, і яны перадаюць вельмі падобныя (або нават аднолькавыя) сігналы гледзішча разрознення і частату абнаўлення, манітор выяўляе, што ёсць новы сігнал і аўтаматычна настаўляе выяву без неабходнасці ўмяшання карыстальніка.<br>OFF (не дзейнічае): пашыранае аўтанастаўленне не дзейнічае.<br>ON (дзейнічае): калі функцыя пашыранага аўтанастаўлення выявіла, што сігнал змяніўся, яна настаўляе манітор згодна з найлепшымі наладамі для новага сігналу. Калі ніякіх змен сігналу не выяўляецца, функцыя нічога не робіць. Пакуль манітор настаўляе сігнал, экран застаецца пустым.<br>OPTION (альтэрнатыўна): Дзейнічае падобна да выпадку, калі абраць «ON», апроч таго, што экран не вымыкаецца на час, пакуль настаўляецца зменены сігнал, што дазваляе манітору хутчэй адлюстроўваць новы сігнал. Значэнні «ON» або «OPTION» зручна выкарыстоўваць, калі ўжываецца вонкавая прылада, якая змяняе між прынамсі двума камп’ютарамі сігнал да манітора.</td></tr>
<tr><td></td><td>AUTO CONTRAST*, *2<br>(аўтакантраст; для аналагавага ўваходу)</td><td>Выпраўляе выявы, атрыманыя з нестандартных відэаўваходаў. Каб наставіць, абярыце «SELECT». Каб выяву можна было наставіць, на ёй мусяць быць белыя ўчасткі.</td></tr>
<tr><td></td><td>CONTRAST*<br>(кантраст; для аналагавага ўваходу)</td><td>Настаўце яскравасць і кантраснасць выявы адносна фону.<br>Каб наставіць, націсніце «улева» або «управа».</td></tr>
<tr><td></td><td>AUTO BLACK LEVEL*, *2<br>(аўтаматычны ўзровень чорнага; для аналагавага ўваходу)</td><td>Аўтаматычная настаўляе ўзровень чорнага. Каб выяву можна было наставіць, на ёй мусяць быць чорныя ўчасткі. Каб задзейнічаць, абярыце «SELECT». AUTO ADJUST (АЎТАНАСТАЎЛЕННЕ).</td></tr>
<tr><td></td><td>BLACK LEVEL*<br>(узровень чорнага; для аналагавага ўваходу)</td><td>Настаўляе ўзровень чорнага RGB паводле ўзроўню ўваходнага сігналу.</td></tr>
</table>

* Толькі для мадэлі PA242W.
*1 Толькі для мадэляў PA272W і PA302W.
*2 Гэты пункт не скідаецца да завадскіх наладаў (метка 7).

| | | |
|---|---|---|
| | VIDEO LEVEL (узровень відэа) (для ўваходу HDMI) | NORMAL (звычайны): налады для камп’ютара. Адлюстроўвае ўсе ўваходныя сігналы ў 0–255 ступеняў.<br>EXPAND (пашыраць): для аўдыя- і відэатэхнікі. Пашырае ўваходныя сігнал ад 16–235 да 0–255 ступеняў.<br>AUTO (аўтаматычна): наладжваецца ў залежнасці ад уваходнага сігналу. |
| Метка 5 | H.POSITION (РАЗМЯШЧЭННЕ ПА ГАРЫЗАНТАЛІ) | Кіруе размяшчэннем выявы па гарызанталі на экране вадкакрышталёвага дысплэя.<br>Каб наставіць, націсніце «улева» або «управа». |
| | V.POSITION (РАЗМЯШЧЭННЕ ПА ВЕРТЫКАЛІ) | Кіруе размяшчэннем выявы па вертыкалі на экране вадкакрышталёвага дысплэя.<br>Каб наставіць, націсніце «улева» або «управа». |
| | H.SIZE* (ШЫРЫНЯ) (для аналагавага ўваходу) | Настаўляе памер экрана па гарызанталі.<br>Калі функцыя «AUTO ADJUST» (аўтанастаўленне) не дала патрэбнага выніку, далей можна наладжваць з дапамогаю функцыі «H.SIZE (V.SIZE)» (сінхранізацыя). Для гэтага можна ўжываць муаравы ўзор. У выніку можа змяніцца шырыня выявы. Змясціць выяву ў сярэдзіне экрана можна кнопкамі «улева» і «управа». КаліШЫРЫНЯ (або вышыня, V.SIZE) настаўленыя неадпаведна, могуць з’явіцца вертыкальныя палосы. Але выява мусіць быць аднароднаю. |
| | FINE* (выразнасць; для аналагавага ўваходу) | Паляпшае фокус, выразнасць і ўстойлівасць выявы, павялічваючы або памяншаючы гэтае значэнне. Калі функцыя «AUTO ADJUST (АЎТАНАСТАЎЛЕННЕ)» і функцыя «H.SIZE» (шырыня) не далі патрэбнага выніку, далей можна наладжваць з дапамогаю функцыі «FINE» (выразнасць). Для гэтага можна ўжываць муаравы ўзор. Калі значэнне выразнасці няправільна наставіць, на дысплэі з’явяцца гарызантальныя лініі. Але выява мусіць быць аднароднаю. |
| | AUTO FINE* (аўтавыразнасць; для аналагавага ўваходу) | Функцыя перыядычна настаўляе выразнасць, каб адпавядаць стану сігналу.<br>Функцыя настаўляецца прыкладна кожныя 33 хвіліны. |
| | H.RESOLUTION (РАЗРОЗНАСЦЬ ПА ГАРЫЗАНТАЛІ) | Выпраўляе шырыню выявы, павялічваючы або памяншаючы гэтае значэнне.<br>Кнопка «управа» павялічвае шырыню выявы на экране.<br>Кнопка «управа» памяншае шырыню выявы на экране. |
| | V.RESOLUTION (РАЗРОЗНАСЦЬ ПА ГАРЫЗАНТАЛІ) | Выпраўляе вышыню выявы, павялічваючы або памяншаючы гэтае значэнне.<br>Кнопка «управа» павялічвае вышыню выявы на экране.<br>Кнопка «управа» памяншае вышыню выявы на экране. |
| | EXPANSION (ПАВЕЛІЧЭННЕ) | Вызначае спосаб, якім павялічваецца выява.<br>FULL (увесь экран): выява расцягваецца на ўвесь экран, незалежна ад разрознасці.<br>ASPECT (суадносіны бакоў): выява расцягваецца, але суадносіны бакоў захоўваюцца.<br>OFF (не дзейнічае): выява не павялічваецца.<br>CUSTOM (самастойна): Калі абраць «CUSTOM», можна будзе настаўляць H.ZOOM, V.ZOOM і ZOOM POS (гарызантальнае, вертыкальнае павелічэнне і размяшчэнне павелічэння). |
| | OVER SCAN (РАЗГОРТВАННЕ) (ДЛЯ ЎВАХОДУ HDMI) | Каб лепей адлюстроўваліся некаторыя відэафайлы, могуць спатрэбіцца іншыя рэжымы адлюстравання.<br>ON (дзейнічае): памер выявы большы за памер, які можна адлюстраваць. Край выявы абрэжацца. На экране адлюструецца прыкладна 95 % выявы.<br>OFF (не дзейнічае): памер выявы застанецца ў межах абсягу адлюстравання. На экране будзе бачна ўсю выяву.<br>AUTO (аўтаматычна): Наладжваецца аўтаматычна. |
| | SIDE BORDER COLOR (КОЛЕР БАКАВОЙ МЯЖЫ) | Настаўляе колер бакавых чорных палос між чорным і белым. |
| Метка 6 | USB SELECTION (выбар USB) | Выбар уваходнага USB-порту для DP/HDMI/DVI-D/D-SUB. Калі да кожнага з уваходных портаў далучаны камп’ютар, можна ўжываць выходныя USB-порты манітора: дастаткова абраць іх на ўваходны сігнал. Калі ўжываецца толькі адзін уваходны порт, будзе выкарыстоўвацца далучаны ўваходны порт.<br>Змяніць порт спалучэнне USB-порту адлюстравання і ўваходнага USB-порту можна з дапамогаю кнопкі «INPUT» (гл. старонку 11).<br>ЗАЎВАГА. Каб не страціць дадзеныя, перад тым як змяняць уваходны порт USB, упэўніцеся, ніводная з прылад USB-сховішча не выкарыстоўваецца аперацыйнай сістэмай камп’ютара, злучанага з уваходным USB-портам. |

* Толькі для мадэлі PA242W.

| | | |
|---|---|---|
| | VIDEO DETECT (ВЫБАР ВІДЭАКРЫНІЦЫ)*2 | Вызначае спосаб, якім будзе абірацца відэа, калі далучылі некалькі крыніц відэа. Каб абраць, націсніце «улева» або «управа».<br>FIRST (першая): калі бягучага ўваходнага відэасігналу няма, манітор пачынае шукаць відэасігнал ад іншага порту відэаўваходу. Калі відэасігнал прысутнічае на іншым порце, тады манітор аўтаматычна пераходзіць на порт знойдзенай відэакрыніцы. Манітор не будзе шукаць іншыя відэасігналы, калі бягучая крыніца відэасігналу прысутнічае.<br>LAST (апошняя): калі ў той час, як манітор адлюстроўвае сігнал бягучай крыніцы, да яго далучыць другую крыніцу, манітор аўтаматычна пяройдзе на новую крыніцу відэасігналу. Калі бягучага ўваходнага відэасігналу няма, манітор пачынае шукаць відэасігнал ад іншага порту відэаўваходу. Калі відэасігнал прысутнічае на іншым порце, тады манітор аўтаматычна пераходзіць на порт знойдзенай відэакрыніцы.<br>NONE (нічога): манітор не будзе шукаць іншы порт відэаўваходу, апроч выпадку, калі манітор толькі што ўмыкнулі. |
| | OFF TIMER (ТАЙМЕР) | Манітор аўтаматычна вымыкаецца праз зададзены прамежак часу з моманту запуску таймера. Калі абралі «ON» (дзейнічае), націсніце кнопку «SELECT» і «улева» або «ўправа», каб наставіць таймер. Перад тым як манітор вымкнецца, на экране з’явіцца паведамленне з пытаннем, ці не жадаеце вы адкласці вымыканне на 60 хвілін. Каб адкласці вымыканне, націсніце на кнопку экраннага меню. |
| | POWER SAVE TIMER (таймер энергазберагання) | ON (дзейнічае): манітор аўтаматычна вымыкаецца, калі дзве гадзіны запар на ўваходзе няма відэасігналу.<br>OFF (не дзейнічае): манітор не будзе вымыкацца, калі адсутнічае відэасігнал. |
| | OFF MODE (вымыканне) | Інтэлектуальны кіраўнік сілкавання дазваляе манітору пераходзіць у стан эканоміі энергіі пасля пэўнага часу бяздзейнасці. У налады вымыкання ўваходзяць чатыры пункты.<br>OFF (не дзейнічае): калі знікае ўваходны сігнал, манітор не пераходзіць у стан эканоміі энергіі.<br>STANDARD (стандартна): манітор пераходзіць у стан эканоміі энергіі, калі знікае ўваходны сігнал.<br>ADVANCED (пашырана): схема выяўлення сігналу заўжды працуе. Манітор вяртаецца ў звычайны стан хутчэй, чым калі абраць «STANDARD» (стандартна), але энергіі спажываецца болей.<br>ЗАЎВАГА. Калі абралі «STANDARD», але выява не адлюстроўваецца, калі вяртаецца крыніца сігналу, трэба абраць пункт «ADVANCED».<br>OPTION (альтэрнатыўна): манітор пераходзіць у стан эканоміі энергіі, калі ўзровень навакольнага асвятлення падае да вызначанага карыстальнікам значэння. |
| | OFF MODE SETTING (налады вымыкання) | Настаўляе значэнне «ILLUMINANCE» (асветленасць) для вымыкання. Паказвае асветленасць. |
| | LED BRIGHTNESS (ЯСКРАВАСЦЬ ЛЯМПАЧКІ)*2 | Кіруе яскравасцю лямпачкі сілкавання манітора. |
| | LED COLOR (колер лямпачкі)*2 | Дазваляе абраць колер лямпачкі на пярэдняй панэлі: сіні або зялёны. |
| Метка 7 | LANGUAGE (МОВА)*2 | Экраннае меню можа адлюстроўвацца на дзевяці мовах. Каб абраць, націсніце «улева» або «управа». |
| | OSD H.POSITION | Дазваляе вызначыць, дзе трэба адлюстроўваць экраннае меню (па гарызанталі). Карыстальнік мае магчымасць самастойна вызначыць, справа ці злева размяшчаць экраннае меню. |
| | OSD V.POSITION | Дазваляе вызначыць, дзе трэба адлюстроўваць экраннае меню (па вертыкалі). Карыстальнік мае магчымасць самастойна вызначыць, зверху ці знізу размяшчаць экраннае меню. |
| | OSD TURN OFF (ТАЙМЕР МЕНЮ) | Экраннае меню будзе адлюстроўвацца, пакуль яно выкарыстоўваецца. Можна абраць, як доўга манітор будзе чакаць пасля апошняга націску на кнопку, перад тым як вымкнуць экраннае меню.<br>Зададзеныя значэнні: ад 10 да 120 секунд з крокам у 5 секунд. |

*2 Гэты пункт не скідаецца да завадскіх наладаў (метка 7).

| | | |
|---|---|---|
| | OSD LOCK OUT (ЗАМКНУЦЬ МЕНЮ)*2 | Дазваляе цалкам зачыніць доступ да ўсіх функцый экраннага меню. Калі паспрабаваць абраць загады экраннага меню, калі яго замкнулі, з’явіцца паведамленне, якое пакажа, што пункты меню замкнёныя.<br>Ёсць тры спосабы замыкаць меню:<br>Замкнуць усе пункты меню: каб задзейнічаць функцыю «Замкнуць меню», націсніце і не адпускайце кнопку «SELECT» (выбар), потым націсніце «управа» і трымайце абедзве кнопкі націснутымі. Каб адамкнуць меню, націсніце і не адпускайце «SELECT», потым націсніце «управа» і трымайце абедзве кнопкі націснутымі, пакуль меню не з’явіцца. У замкнёным меню нельга абраць ніводнага пункту.<br>Замкнуць і пакінуць магчымасць кіраваць толькі яскравасцю: каб замкнуць меню, націсніце і не адпускайце «SELECT», потым націсніце кнопкі «уніз», «улева» і трымайце ўсе кнопкі націснутымі. Каб адамкнуць меню, націсніце і не адпускайце «SELECT», потым націсніце «уніз», «улева» і трымайце ўсе кнопкі націснутымі, пакуль меню не з’явіцца. У замкнёным такім чынам меню можна настаўляць яскравасць.<br>CUSTOM (самастойна): Каб увайсці ў меню «CUSTOM», націсніце «RESET» (скінуць) і «EXIT» (выхад). Абярыце «ENABLE» (дазволіць) або «DISABLE» (забараніць) для пунктаў «POWER KEY» (кнопка сілкавання), «INPUT SEL» (выбар уваходу), «HOT KEY (BRIGHTNESS)» — выклічнік (яскравасць), «PICTURE MODE» (рэжым выявы), «WARNING (RESOLUTION NOTIFIER/OSD LOCK OUT)» (папярэджанне: разрозненне і замыканне меню). Каб адамкнуць меню, спачатку націсніце «RESET» і «EXIT», каб з’явілася папярэджанне.<br>Потым націсніце: SELECT, SELECT, <, >, <, >, EXIT. |
| | OSD TRANSPARENCY (ПРАЗРЫСТАСЦЬ МЕНЮ) | Настаўляе празрыстасць экраннага меню. |
| | OSD COLOR (колер экраннага меню)*2 | Дазваляе абраць колеры наступных складнікаў: «Tag window frame color» (рамка вакна меткі), «Item select color» (абраны пункт) і «Adjust window frame color» (рамка вакна настаўлення). |
| | BOOT LOGO (значок пры запуску)*2 | Калі манітор умыкаецца, на экране нядоўгі час адлюстроўваецца значок «NEC». Забараніць або дазволіць гэта можна ў экранным меню.<br>Заўвага. Калі націснуць і ўтрымліваць кнопку «EXIT», пакуль адлюстроўваецца значок «NEC», з’явіцца меню значка пры запуску. У гэтым меню можна змяніць налады «BOOT LOGO» (значок пры запуску) на «OFF» (не паказваць). |
| | SIGNAL INFORMATION (ЗВЕСТКІ ПРА СІГНАЛ)*2 | Звесткі пра сігнал могуць адлюстроўвацца ў куце экрана.<br>Можна абраць «ON» (адлюстроўваць) або «OFF» (не адлюстроўваць). |
| | RESOLUTION NOTIFIER*2 (ПАВЕДАМЛЕННЕ ПРА РАЗРОЗНАСЦЬ) | Найлепшая разрознасць для мадэлі PA242W — 1920 × 1200, PA272W — 2560 × 1440, PA302W — 2560 × 1600. Калі абраць «ON», на працягу 30 секунд будзе адлюстроўвацца папярэджанне пра тое, што разрознасць не роўная 1920 × 1200 — для мадэлі PA242W, 2560 × 1440 — для мадэлі PA272W, 2560 × 1600 — для мадэлі PA302W.<br>Каб абраць, націсніце «улева» або «управа». |
| | HOT KEY*2 (ВЫКЛІЧНІКІ) | Калі гэтая функцыя дзейнічае, можна настаўляць яскравасць, не ўваходзячы ў экраннае меню — з дапамогаю кнопак на пярэдняй панэлі.<br>Кнопкі «улева» і «управа» настаўляюць узровень яскравасці.<br>Калі ўсталяваць значэнне «OFF», пэўныя кнопкі не будуць дзейнічаць.<br>Гл. старонку 11. |
| | FACTORY PRESET*2 (ЗАВАДСКІЯ НАЛАДЫ) | Калі абраць пункт «FACTORY PRESET», гэта дазволіць скінуць усе налады экраннага меню да завадскіх значэнняў. Асобныя налады можна скінуць, калі абраць патрэбны пункт меню і націснуць кнопку «RESET» (скінуць). |
| Метка 8 | PIP MODE (рэжымы «выява ў выяве») | Дазваляе абраць PIP MODE (рэжым «выявы ў выяве»), OFF/PIP/PICTURE BY PICTURE — ASPECT/PICTURE BY PICTURE — FULL (не дзейнічае/выява ў выяве/выява побач з выяваю — суадносіны/выява побач з выяваю — на ўвесь экран).<br>Гл. старонку 14. |
| | PIP INPUT (уваход для «выявы ў выяве») | Абірае ўваходны сігнал рэжыму «выява ў выяве». |
| | PIP LEFT/RIGHT (выява злева або справа) | Калі абраць у раздзеле «PIP MODE» рэжым «PIP» (выява ў выяве), можна змяняць гарызантальнае размяшчэнне абсягу, дзе адлюстроўваецца выява ў выяве. |

*2 Гэты пункт не скідаецца да завадскіх наладаў (метка 7).

| | | |
|---|---|---|
| | PIP DOWN/UP (выява зверху або знізу) | Калі абраць у раздзеле «PIP MODE» рэжым «PIP» (выява ў выяве), можна змяняць вертыкальнае размяшчэнне абсягу, дзе адлюстроўваецца выява ў выяве. |
| | PIP SIZE (памер другой выявы) | Вызначае памер дадатковае выявы ў рэжыме «выява ў ВЫЯВЕ». |
| | BLANK SIGNAL SKIP (прапускаць пусты сігнал) | Калі карыстальнік змяняе ўваходны сігнал кнопкаю «INPUT» (уваход), прапускаць уваходы, на якіх няма сігналу. |
| | OSD ROTATION (ПАВАРОТ МЕНЮ) | AUTO (аўтаматычна): Экраннае меню паварочваецца разам маніторам.<br>Стандартнае значэнне — AUTO (аўтаматычна).<br>LANDSCAPE (АЛЬБОМНАЯ): адлюстроўвае экраннае меню ў альбомнай арыентацыі.<br>PORTRAIT (КНІЖНАЯ): адлюстроўвае экраннае меню ў кніжнай арыентацыі. |
| | MAIN IMAGE ROTATION (ПАВАРОТ ГАЛОЎНАЙ ВЫЯВЫ) | AUTO (аўтаматычна): Выява ў галоўным акне паварочваецца ў адпаведнасці з арыентацыяй дысплэя.<br>OFF (не дзейнічае): Выява ў галоўным акне не паварочваецца. MAIN IMAGE ROTATION (паварот выявы) стандартна —OFF (не паварочваецца).<br>ON (дзейнічае): Выява ў галоўным акне заўжды паварочваецца.<br>Заўвага. На мадэлях PA272W і PA302W функцыя будзе дзейнічаць, толькі калі абралі «PICTURE BY PICTURE-ASPECT» або «PICTURE BY PICTURE-FULL». |
| | SUB IMAGE ROTATION (паварот дадатковай выявы) | AUTO (аўтаматычна): Выява ў дадатковым акне паварочваецца ў адпаведнасці з арыентацыяй дысплэя.<br>OFF (не дзейнічае): Выява ў дадатковым акне не паварочваецца. Стандартнае значэнне — OFF (не паварочваецца).<br>ON (дзейнічае): Выява ў дадатковым акне заўжды паварочваецца. |
| | DDC/CI | Значэнні «ENABLE» і «DISABLE» адпаведна дазваляюць і забараняюць двухбаковую перадачу дадзеных з далучаным камп'ютарам і кіраванне праз кабель відэасігналу.<br>ЗАЎВАГА. Усталёўвайце значэнне «ENABLE» для DDC/CI, калі калібруеце абсталяванне праз DisplayPort, DVI або VGA з дапамогаю такіх праграм, як «MultiProfiler». |
| | SCREEN SAVER (АХОЎНІК ЭКРАНА) | Каб не з'яўлялася рэшткавая выява, выкарыстоўвайце ахоўнік экрана.<br>MOTION (рух, стандартна — OFF): Выява на экране перыядычна перамяшчаецца ў чатырох напрамках для таго, каб паменшыць рызыку з'яўлення рэшткавае выявы. Прамежкі руху можна ўсталяваць так, што выява будзе перамяшчацца кожныя 10–900 секундаў. Час настаўляецца з крокам у 10 секунд.<br>OPTION (дадаткова; стандартна — REDUCED): Дзве дадатковыя магчымасці.<br>REDUCED (памяншэнне): выява на экране памяншаецца да 95 % ад пачатковага памеру і час ад часу рухаецца ў чатырох напрамках. Экран можа выглядаць крыху менш рэзкім, чым звычайна. На экране адлюстроўваецца поўная выява.<br>ЗАЎВАГА. Рэжым «REDUCED» можа падтрымліваць не ўсе ўваходныя сігналы.<br>FULL (увесь экран): выява размяшчаецца на ўвесь экран і час ад часу рухаецца ў чатырох напрамках. Выява выходзіць за межы абсягу адлюстравання адлюстравання ў кірунку руху, таму частка выявы можа абразацца.<br>ЗАЎВАГА. Ахоўнік экрана працуе тады, калі параметр «ENABLE» функцыі «TILE MATRIX» — «OFF» і «PIP MODE» — таксама «OFF». |
| Метка 9* (для аналагавага ўваходу) | INPUT SETTING (НАЛАДЫ ЎВАХОДУ)*2 | Шырыня паласы прапускання відэа (англ. «Video Band Width»): памяншае ўзровень «шуму» уваходнага сігналу. Гэта вельмі неэфектыўна, таму значэнне застаецца малым. Каб абраць, націсніце «улева» або «управа».<br>Парог сінхранізацыі (англ. «Sync Threshold»): настаўляе ўзровень сігналу сінхранізацыі. Каб перамяшчацца ў меню настаўленняў, абярыце «SELECT». Настаўляе адчувальнасць асобных або складаных уваходных сігналаў. Гэта варта спрабаваць тады, калі функцыя FINE (выразнасць) прыбірае не ўвесь шум.<br>Пазіцыя захопу (англ. «Clamp position»): выкарыстанне манітора з нестандартнай сінхранізацыяй можа зрабіць выяву цямнейшаю, чым звычайна, або можа сказіць колеры. Каб вярнуць выяву ў звычайны стан, карыстайцеся гэтымі наладамі. |

* Толькі для мадэлі PA242W.

*2 Гэты пункт не скідаецца да завадскіх наладаў (метка 7).

| | | |
|---|---|---|
| Метка A | TILE MATRIX (МАЗАІКА) | Функцыя « TILE MATRIX (МАЗАІКА)» дазваляе адлюстроўваць адну выяву адразу на некалькіх экранах. Функцыя можа выкарыстоўвацца на 25 маніторах (5 вертыкальных і 5 гарызантальных). Каб карыстацца функцыяй « TILE MATRIX (МАЗАІКА)», трэба, каб выходны сігнал камп’ютара праходзіў на кожны манітор праз размеркавальны ўзмацняльнік.<br>H MONITOR (па гарызанталі): колькасць дысплэяў па гарызанталі.<br>V MONITOR (па вертыкалі): колькасць дысплэяў па вертыкалі.<br>MONITOR No (манітор №): абірае размяшчэнне для пашырэння экрана.<br>TILE COMP (ураўноўваць мазаіку): Працуе з функцыяй « TILE MATRIX (МАЗАІКА)» і дапасоўвае выяву да шырыні панэляў манітораў, каб дакладна яе адлюстроўваць.<br>Ураўноўванне на чатырох маніторах (чорны абсяг — рамка манітора):<br><br>TILE COMP — OFF<br><br>TILE COMP — ON<br>ЗАЎВАГА. Функцыя ўраўноўвання мазаікі працуе, калі значэнне «PIP MODE» — «OFF». |
| Метка B | CARBON SAVINGS (зберагание вугляроду) | Ацэньвае, колькі зберaглі вугляроду (у кілаграмах). |
| | CARBON USAGE (выкарыстанне вугляроду) | Ацэньвае, колькі выкарысталі вугляроду (у кілаграмах). Гэта арыфметычная ацэнка, а не сапраўднае значэнне. Гэтая ацэнка не мае наладаў. |
| | COST SAVINGS (эканомія) | Паказвае эканомію электраэнергіі ў балансе. |
| | CARBON CONVERT SETTING (налады падліку вугляроду) | Настаўляе множнік вугляроднага следу ў падліках зберагання вугляроду. Пачатковыя налады грунтуюцца на дадзеных Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (OECD)за 2008 год. |
| | CURRENCY SETTING*2 (грашовыя налады) | Паказвае кошт электраэнергіі ў 6 грашовых адзінках. |
| | CURRENCY CONVERT SETTING (тарыф) | Вызначае, колькі каштуе адзінка энергіі, для падлікаў эканоміі. |
| | HOURS RUNNING*2 (час працы) | Паказаць агульны час працы. |
| | SELF COLOR CORRECTION (АЎТАВЫПРАЎЛЕННЕ КОЛЕРУ) | Выкарыстоўвае ўнутраны датчык колеру, каб выправіць зрух колеру, які з’яўляецца з цягам часу. |
| | STAND-ALONE CALIBRATION* (САМАСТОЙНАЯ КАЛІБРОЎКА) | З дапамогаю дадатковага USB-датчыка колеру выпраўляе зрух у жаўтаватыя колеры ад працяглага выкарыстання. Гл. старонку 35. Калі выкарыстоўваць гэта, функцыя «SELF COLOR CORRECTION» не патрэбная. |
| Метка C | INFORMATION*2 (ЗВЕСТКІ) | Інфармацыя пра дзейнае разрозненне дысплэя. Тэхнічныя дадзеныя, у тым ліку: прадвызначаная сінхранізацыя, частата гарызантальнай і вертыкальнай разгорткі. |

* Толькі для мадэлі PA302W.

*2 Гэты пункт не скідаецца да завадскіх наладаў (метка 7).

# Характарыстыкі — PA242W

| Характарыстыкі манітора | MultiSync PA242W | Заўвагі |
|---|---|---|
| Дыяганаль ВК-модуля:<br>Памер бачнай выявы:<br>Стандартная разрознасць (пікселі): | 61,1 см (24,1 цалі)<br>61,1 см (24.1 цалі)<br>1920 × 1200 | Актыўная матрыца; вадкакрышталёвы дысплэй (LCD) на тонкаплеўкавых транзістарах (TFT); 0,270 мм на кропку; 340 кд/м² (яскравасць белага); кантрастнасць 1000:1 (звычайная). |
| Уваходны сігнал | | |
| DisplayPort: Раздым DisplayPort: | Лічбавы RGB | DisplayPort адпавядае стандарту версіі 1.1a, які тычыцца абароны шырокапалоснага лічбавага змесціва (HDCP) |
| DVI: 24-кантактны DVI-D: | Лічбавы RGB | DVI (HDCP) |
| VGA: 15-кантактны міні-раздым D-sub: | Аналагавы RGB<br>Сінхранізацыя | 0,7 Vp-p/75 Ом<br>Асобная сінхранізацыя ўзроўню TTL (адмоўная і дадатная)<br>Складаная сінхранізацыя ўзроўню TTL (адмоўная і дадатная) |
| HDMI: Раздым HDMI: | Лічбавы RGB | HDMI (HDCP) |
| Колькасць колераў | 1 073 741 824 (DisplayPort/HDMI, 10 біт)<br>16 777 216 (DVI) | Залежыць ад відэакарткі, якая выкарыстоўваецца. |
| Дыяпазон сінхранізацыі Гарызантальная:<br>Вертыкальная: | Ад 31,5 кГц да 93,8 кГц, 118,4 кГц*2 (аналагавы)<br>Ад 31,5 кГц да 91,1 кГц, 118,4 кГц*2 (лічбавы)<br>Ад 50 Гц да 85 Гц | Аўтаматычна<br>Аўтаматычна<br>Аўтаматычна |
| Вугал агляду Гарызантальны:<br>Вертыкальны: | ±89° (кантрастнасць > 10)<br>±89° (кантрастнасць > 10) | |
| Час стварэння выявы | 8 мс (між узроўнямі шэрага, тып.) | |
| Магчымыя разрознасці (Некаторыя сістэмы падтрымліваюць не ўсе пералічаныя рэжымы). | 640 × 480*1 пры 60–85 Гц<br>720 × 400*1 пры 70–85 Гц<br>800 × 600*1 пры 56–85 Гц<br>832 × 624*1 пры 75 Гц<br>1024 × 768*1 пры 60–85 Гц<br>1280 × 960*1 пры 60–85 Гц<br>1280 × 1024*1 пры 60–85 Гц<br>1600 × 1200*1 пры 60 Гц<br>1920 × 1200 пры 60 Гц.......................................<br>1400 × 1050*1 пры 60–75 Гц<br>1400 × 900*1 пры 60–85 Гц<br>1600 × 1200*1 пры 65–75 Гц (аналагавы)<br>480P (720 × 480*1 пры 60 Гц)<br>576P (720 × 576*1 пры 60 Гц)<br>720P (1280 × 720*1 пры 50–60 Гц)<br>1080P (1920 × 1080*1 пры 50–60 Гц)<br>960 × 1200*1 пры 60 Гц<br>1200 × 960*1 пры 60 Гц<br>1200 × 1920 пры 60 Гц | Разрознасць, якую «NEC Display Solutions» для найлепшае працы дысплэя. |
| Дзейны абсяг дысплэя: Альбомная: Гарыз.:<br>Верт.:<br>Кніжная арыентацыя: Гарыз.:<br>Верт.: | 518,4 мм/20,4 цалі<br>324,0 мм/12,8 цалі<br>324,0 мм/12,8 цалі<br>518,4 мм/20,4 цалі | |
| USB-канцэнтратар Інтэрфейс:<br>Парты:<br><br>Ток нагрузкі: | Спецыфікацыя USB версіі 2.0<br>Уваходны 2<br>Выходных 3<br>Не болей за 0,5 A на порт | |
| Блок сілкавання | Зменны ток 100–240 В, 50 або 60 Гц | |
| Ток | 0,84–0,38 A (з дадатковымі прыладамі) | |
| Габарыты Альбомная арыентацыя:<br><br>Кніжная арыентацыя:<br><br>Настаўленне вышыні: | 556,8 мм (Ш) × 378–528 мм (В) × 227,6 мм (Г)<br>21,9 цалі (Ш) × 14,9–20,8 цалі (В) × 9,0 цалі (Г)<br>362,4 мм (Ш) × 572,4–625,2 мм (В) × 227,6 мм (Г)<br>14,3 цалі (Ш) × 22,5–24,6 цалі (В) × 9,0 цалі (Г)<br>150 мм (5,9 цалі) — альбомная арыентацыя<br>52,8 мм (2,1 цалі) — кніжная арыентацыя | |
| Маса | 10,6 кг (23,4 фунта)г | |
| Умовы навакольнага асяроддзя<br>Працоўная тэмпература:<br>Вільготнасць:<br>Вышыня над узроўнем мора:<br>Тэмпература захоўвання:<br>Вільготнасць:<br>Вышыня над узроўнем мора: | <br>Ад 5 °C да 35 °C (ад 41 °F да 95 °F)<br>Ад 20 % ад 80 %<br>Ад 0 да 2 000 м (ад 0 да 6 562 футаў)<br>Ад -10 °C да 60 °C (ад 14 °F да 140 °F)<br>Ад 10 % да 85 %<br>Ад 0 да 12 192 м (ад 0 да 40 000 футаў) | |

*1 Разрознасці інтэрпалююцца: калі выкарыстоўваецца разрознасць з колькасцю піксаляў, меншаю за колькасць піксаляў вадкакрышталёвага модуля, тэкст можа выглядаць незвычайна. Гэта нармальна і аднолькава для ўсіх тэхналогій плоскіх экранаў, калі нестандартная разрознасць адлюстроўваецца на поўны экран. У тэхналогіі плоскіх экранаў кожная кропка экрана з'яўляецца сапраўды адным пікселем, таму каб разгарнуць разрознасць на ўвесь экран, трэба інтэрпаляваць яго.
*2 Толькі для разрознасці 1200 × 1920.

**ЗАЎВАГА.** Тэхнічныя характарыстыкі могуць змяняцца вытворцам без папярэджання.

# Характарыстыкі — PA272W

| Характарыстыкі манітора | MultiSync PA272W | Заўвагі |
|---|---|---|
| Дыяганаль ВК-модуля:<br>Памер бачнай выявы:<br>Стандартная разрознасць (пікселі): | 68,5 см/27,0 цаляў<br>68,5 см/27,0 цаляў<br>2560 × 1440 | Актыўная матрыца; вадкакрышталёвы дысплэй (LCD) на тонкаплеўкавых транзістарах (TFT); 0,233 мм на кропку; яскравасць белага 340 кд/м²; кантрастнасць (звычайная) — 1000:1. |
| Уваходны сігнал | | |
| DisplayPort: Раздым «DisplayPort»:<br>Раздым міні-DisplayPort: | Лічбавы RGB | DisplayPort адпавядае стандарту версіі 1.1a, які тычыцца абароны шырокапалоснага лічбавага змесціва (HDCP) |
| DVI: 24-кантактны «DVI-D»: | Лічбавы RGB | DVI (HDCP) |
| HDMI: Раздым «HDMI»: | Лічбавы RGB | HDMI (HDCP) |
| Колькасць колераў | 1 073 741 824 (DisplayPort, міні-DisplayPort, 10-бітны HDMI)<br>16 777 216 (DVI) | Залежыць ад відэакарткі, якая выкарыстоўваецца. |
| Дыяпазон сінхранізацыі Гарызантальная:<br>Па вертыкалі: | Ад 31,5 кГц да 93,9 кГц<br>Ад 50 Гц да 87 Гц | Аўтаматычна<br>Аўтаматычна |
| Вугал агляду Гарызантальны:<br>Вертыкальны: | ±89° (кантрастнасць > 10)<br>±89° (кантрастнасць > 10) | |
| Час стварэння выявы | 7 мс (між узроўнямі шэрага, тып.) | |
| Магчымыя разрознасці (некаторыя сістэмы падтрымліваюць не ўсе пералічаныя рэжымы). | 640 × 480*1 пры 60–85 Гц<br>720 × 350*1 пры 70–85 Гц<br>720 × 400*1 пры 70–85 Гц<br>800 × 600*1 пры 56–85 Гц<br>832 × 624*1 пры 75 Гц<br>1024 × 768*1 пры 60–85 Гц<br>1152 × 864*1 пры 70–85 Гц<br>1152 × 870*1 пры 75 Гц<br>1152 × 900*1 пры 66 Гц<br>1280 × 960*1 пры 60 Гц<br>1280 × 1024*1 пры 60–85 Гц<br>1400 × 1050*1 пры 60–75 Гц<br>1440 × 900*1 пры 60–85 Гц<br>1600 × 1200*1 пры 60 Гц<br>1680 × 1050*1 пры 60 Гц<br>1920 × 1200*1 пры 60 Гц<br>1024 × 1280*1 пры 60 Гц<br>1200 × 1920*1 пры 60 Гц<br>2560 × 1440 пры 60 Гц.......................................<br>480P (720 × 480*1 пры 60 Гц)<br>576P (720 × 576*1 пры 50 Гц)<br>720P (1280 × 720*1 пры 50–60 Гц)<br>1080P (1920 × 1080*1 пры 50–60 Гц) | Разрознасць, якую раіць «NEC DISPLAY SOLUTIONS» для найлепшае працы дысплэя. |
| Дзейны абсяг дысплэя: Альбомная: Гарыз.:<br>Верт.:<br>Кніжная арыентацыя: Гарыз.:<br>Верт.: | 597 мм/23,5 цалі<br>336 мм/13,2 цалі<br>336 мм/13,2 цалі<br>597 мм/23,5 цалі | |
| USB-канцэнтратар Інтэрфейс:<br>Парты:<br><br>Ток нагрузкі: | Спецыфікацыя USB версіі 2.0<br>Уваходны 2<br>Выходных 3<br>Не болей за 0,5 А на порт | |
| Блок сілкавання | Зменны ток 100–240 В, 50 або 60 Гц | |
| Ток | 1,0–0,45 А (з дадатковымі прыладамі) | |
| Габарыты Альбомная арыентацыя:<br><br>Кніжная арыентацыя:<br><br>Настаўленне вышыні: | 640,4 мм (Ш) × 396,2–546,2 мм (В) × 235,5 мм (Г)<br>25,2 цалі (Ш) × 15,6–21,5 цалі (В) × 9,3 цалі (Г)<br>378,6 мм (Ш) × 658,0–677,1 мм (В) × 235,5 мм (Г)<br>14,9 цалі (Ш) × 25,9–26,7 цалі (В) × 9,3 цалі (Г)<br>150 мм (5,9 цалі) — альбомная арыентацыя<br>19,1 мм (0,8 цалі) — кніжная арыентацыя | |
| Маса | 12,9 кг (28,4 фунта) | |
| Умовы навакольнага асяроддзя<br>Працоўная тэмпература:<br>Вільготнасць:<br>Вышыня над узроўнем мора:<br>Тэмпература захоўвання:<br>Вільготнасць:<br>Вышыня над узроўнем мора: | <br>Ад 5 °C да 35 °C (ад 41 °F да 95 °F)<br>Ад 20 % ад 80 %<br>Ад 0 да 10 000 м (ад 0 да 3 048 футаў)<br>Ад -10 °C да 60 °C (ад 14 °F да 140 °F)<br>Ад 10 % да 85 %<br>Ад 0 да 12 192 м (ад 0 да 40 000 футаў) | |

*1 Разрознасці інтэрпалююцца: калі выкарыстоўваецца разрознасць з колькасцю піксаляў, меншаю за колькасць піксаляў вадкакрышталёвага модуля, тэкст можа выглядаць незвычайна. Гэта нармальна і аднолькава для ўсіх тэхналогій плоскіх экранаў, калі нестандартная разрознасць адлюстроўваецца на поўны экран. У тэхналогіі плоскіх экранаў кожная кропка экрана з'яўляецца сапраўды адным пікселам, таму каб разгарнуць разрознасць на ўвесь экран, трэба інтэрпаляваць яго.

**ЗАЎВАГА.** Тэхнічныя характарыстыкі могуць змяняцца вытворцам без папярэджання.

# Характарыстыкі — PA302W

| Характарыстыкі манітора | MultiSync PA302W | Заўвагі |
|---|---|---|
| Дыяганаль ВК-модуля:<br>Памер бачнай выявы:<br>Стандартная разрознасць (пікселі): | 75,6 см/29,8 цаляў<br>75,6 см/29,8 цаляў<br>2560 × 1600 | Актыўная матрыца; вадкакрышталёвы дысплэй (LCD) на тонкаплеўкавых транзістарах (TFT); 0,251 мм на кропку; яскравасць белага 340 кд/м$^2$; кантрастнасць (звычайная) — 1000:1. |
| Уваходны сігнал | | |
| DisplayPort: Раздым «DisplayPort»:<br>Раздым міні-DisplayPort: | Лічбавы RGB | DisplayPort адпавядае стандарту версіі 1.1a, які тычыцца абароны шырокапалоснага лічбавага змесціва (HDCP) |
| DVI: 24-кантактны «DVI-D»: | Лічбавы RGB | DVI (HDCP) |
| HDMI: Раздым «HDMI»: | Лічбавы RGB | HDMI (HDCP) |
| Колькасць колераў | 1 073 741 824 (DisplayPort, міні-DisplayPort, 10-бітны HDMI)<br>16 777 216 (DVI) | Залежыць ад відэакарткі, якая выкарыстоўваецца. |
| Дыяпазон сінхранізацыі Гарызантальная:<br>Па вертыкалі: | Ад 31,5 кГц да 98,7 кГц<br>Ад 30 Гц да 87 Гц | Аўтаматычна<br>Аўтаматычна |
| Вугал агляду Гарызантальны:<br>Вертыкальны: | ±89° (кантрастнасць > 10)<br>±89° (кантрастнасць > 10) | |
| Час стварэння выявы | 7 мс (між узроўнямі шэрага, тып.) | |
| Магчымыя разрознасці (некаторыя сістэмы падтрымліваюць не ўсе пералічаныя рэжымы). | 640 × 480*1 пры 60–85 Гц<br>720 × 350*1 пры 70–85 Гц<br>720 × 400*1 пры 70–85 Гц<br>800 × 600*1 пры 56–85 Гц<br>832 × 624*1 пры 75 Гц<br>1024 × 768*1 пры 60–85 Гц<br>1152 × 864*1 пры 70–85 Гц<br>1152 × 870*1 пры 75 Гц<br>1152 × 900*1 пры 66 Гц<br>1280 × 960*1 пры 60 Гц<br>1280 × 1024*1 пры 60–85 Гц<br>1400 × 1050*1 пры 60–75 Гц<br>1440 × 900*1 пры 60–85 Гц<br>1600 × 900*1 пры 60 Гц<br>1600 × 1200*1 пры 60 Гц<br>1680 × 1050*1 пры 60 Гц<br>1920 × 1200*1 пры 60 Гц<br>2048 × 1536*1 пры 30 Гц<br>1024 × 1280*1 пры 60 Гц<br>2560 × 1600 пры 60 Гц........................................<br>480P (720 × 480*1 пры 60 Гц)<br>576P (720 × 576*1 пры 50 Гц)<br>720P (1280 × 720*1 пры 50–60 Гц)<br>1080P (1920 × 1080*1 пры 50–60 Гц) | Разрознасць, якую раіць «NEC DISPLAY SOLUTIONS» для найлепшае працы дысплэя. |
| Дзейны абсяг дысплэя: Альбомная: Гарыз.:<br>Верт.:<br>Кніжная арыентацыя: Гарыз.:<br>Верт.: | 641 мм/25,2 цалі<br>401 мм/15,8 цалі<br>401 мм/15,8 цалі<br>641 мм/25,2 цалі | |
| USB-канцэнтратар Інтэрфейс:<br>Порт:<br><br>Ток нагрузкі: | Спецыфікацыя USB версіі 2.0<br>Уваходны 2<br>Выходных 3<br>Не болей за 0,5 А на порт | |
| Блок сілкавання | Зменны ток 100–240 В, 50 або 60 Гц | |
| Ток | 1,1–0,51 А (з дадатковымі прыладамі) | |
| Габарыты Альбомная арыентацыя:<br><br>Кніжная арыентацыя:<br><br>Настаўленне вышыні: | 688,0 мм (Ш) × 466,4–616,4 мм (В) × 301,6 мм (Г)<br>27,1 цалі (Ш) × 18,4–24,3 цалі (В) × 11,9 цалі (Г)<br>446,8 мм (Ш) × 707,1–737,0 мм (В) × 301,6 мм (Г)<br>17,6 цалі (Ш) × 27,8–29,0 цалі (В) × 11,9 цалі (Г)<br>150 мм (5,9 цалі) — альбомная арыентацыя<br>29,9 мм (1,2 цалі) — кніжная арыентацыя | |
| Маса | 17 кг (37,5 фунта) | |
| Умовы навакольнага асяроддзя<br>Працоўная тэмпература:<br>Вільготнасць:<br>Вышыня над узроўнем мора:<br>Тэмпература захоўвання:<br>Вільготнасць:<br>Вышыня над узроўнем мора: | <br>Ад 5 °C да 35 °C (ад 41 °F да 95 °F)<br>Ад 20 % ад 80 %<br>Ад 0 да 10 000 м (ад 0 да 3 048 футаў)<br>Ад -10 °C да 60 °C (ад 14 °F да 140 °F)<br>Ад 10 % да 85 %<br>Ад 0 да 12 192 м (ад 0 да 40 000 футаў) | |

*1 Разрознасці інтэрпалююцца: калі выкарыстоўваецца разрознасць з колькасцю пікселяў, меншаю за колькасць пікселяў вадкакрышталёвага модуля, тэкст можа выглядаць незвычайна. Гэта нармальна і аднолькава для ўсіх тэхналогій плоскіх экранаў, калі нестандартная разрознасць адлюстроўваецца на поўны экран. У тэхналогіі плоскіх экранаў кожная кропка экрана з'яўляецца сапраўды адным пікселем, таму каб разгарнуць разрознасць на ўвесь экран, трэба інтэрпаляваць яго.

**ЗАЎВАГА.** Тэхнічныя характарыстыкі могуць змяняцца вытворцам без папярэджання.

# Функцыі

**DisplayPort:** стандарт DisplayPort распрацоўваўся, каб мець магчымасць пашырацца і адпавядаць вырашэнням высокапрадукцыйнага лічбавага злучэння для дысплэя, якія з’явяцца ў будучыні. Гэты стандарт дазваляе ўжываць сама высокія разрознасці, частоты абнаўлення і такую глыбіню колераў, што не могуць забяспечыць звычайныя кабелі.

**HDMI:** стандарт «HDMI» распрацоўваўся, каб мець магчымасць пашырацца і адпавядаць вырашэнням высокапрадукцыйнага лічбавага злучэння для дысплэя, якія з’явяцца ў будучыні. Гэты стандарт дазваляе ўжываць сама высокія разрознасці, частоты абнаўлення і такую глыбіню колераў, што не могуць забяспечыць звычайныя кабелі.

**DFP (плоская лічбавая панэль):** цалкам лічбавай інтэрфейс для плоскапанэльных манітораў, сумяшчальных па сігнале з DVI. Толькі лічбавае злучэнне, якое грунтуецца на DVI, таму для сумяшчальнасці DFP і іншага злучальніка трэба толькі адзін просты пераходнік накшталт DVI і P&D.

**P&D (далучы і паказвай):** стандарт VESA для інтэрфейсаў лічбавых плоскапанэльных манітораў. Найдзейнейшы за DFP, бо дазваляе выкарыстоўваць іншыя магчымасці, апроч аднаго злучальніка (напрыклад, USB, аналагавае відэа і IEEE-1394-995). Камітэт VESA прызнаў, што DFP з'яўляецца падмноствам P&D. Злучальнік грунтуецца на DVI (штыры лічбавага ўваходу), таму для сумяшчальнасці P&D і іншага злучальніка, які грунтуецца на DVI, трэба толькі адзін пераходнік накшталт DVI і P&D.

**Паваротная стойка:** дазваляе карыстальнікам наладжваць арыентацыю манітора пад свае патрэбы: альбомная для шырокіх дакументаў або кніжная для папярэдняга прагляду цэлай старонкі на ўвесь экран. Кніжная арыентацыя таксама зручная для поўнаэкранных рэжыму відэанарадаў.

**Паменшаны вугляродны след:** Найлепшае вырашэнне, калі прастора абмежаваная, але трэба цудоўная якасць выявы. Малая плошчу, займаная маніторам, і невялікая вага дазваляюць кніжная перамяшчаць або перавозіць яго лёгка з аднаго месца ў іншае.

**Сістэмы кіравання колерам:** дазваляе настаўляць колеры на экране і наладжваць дакладнасць перадачы колераў маніторам у адпаведнасці з шэрагам стандартаў.

**Матрыца натуральных колераў:** аб’ядноўвае 6 восей кіравання колерам і стандарт sRGB. Шэсць восей кіравання колерам дазваляюць настаўляць колеры па шасці (R, G, B, C, M і Y), а не па трох восях (R, G і B), як раней. Стандарт sRGB стандарт задае адзіны профіль колераў для манітора. Ён гарантуе, што колеры на маніторы дакладна такія ж, як на каляровай раздрукоўцы (з прынтара і аперацыйнай сістэмы, якія падтрымліваюць sRGB). Гэта дазваляе настаўляць колеры на экране і наладжваць дакладнасць перадачы колераў манітора згодна з шэрагам стандартаў.

**Экраннае меню (OSD):** дазваляе хутка і лёгка настаўляць на экране ўсе характарыстыкі выявы з дапамогаю простых у выкарыстанні экранных меню.

**Эрганамічныя характарыстыкі:** удасканаленая эрганоміка паляпшае карыстальнікам умовы працы, дапамагае ахоўваць здароўе і ашчаджаць грошы. Прыклады: пункты экраннага меню дазваляюць хутка і лёгка наладзіць малюнак; карыстальнік можа нахіліць манітор, каб атрымаць патрэбны вугал бачання; невялікія памеры і адпаведнасць патрабаванням MPR II і TCO па нізкім узроўні выпрамянення.

**Далучы і ўжывай:** вырашэнне ад «Microsoft®» у аперацыйнай сістэме «Windows®», якое дазваляе працей наладжваць і ўсталёўваць абсталяванне, дазваляючы манітору перадаваць звесткі пра свае ўласцівасці (напрыклад, памер экрана і дазволеныя разрознасці) непасрэдна на камп’ютар, што паляпшае працу дысплэя.

**Інтэлектуальная сістэма сілкавання:** перадавыя спосабы эканоміць электраэнергію, якія дазваляюць манітору пераходзіць у стан паніжанага спажывання электраэнергіі, калі яго ўмыкнулі, але не выкарыстоўваюць, што дае эканомію ў дзве трацiны выдаткаў энергіі на манітор, а таксама памяншае выпрамяненне і выдаткі на ахаладжванне паветра на працоўным месцы.

**Тэхналогія шматлікіх частотаў:** манітор аўтаматычна настаўляецца на частату разгорткі відэакарткі, і такім чынам адлюстроўвае неабходную разрознасць.

**Выява на ўвесь экран:** дазваляе выкарыстоўваць увесь абсяг экрана амаль пры ўсіх разрознасцях, што значна павялічвае памер выявы.

**Тэхналогія шырокага вугла агляду:** дае магчымасць глядзець на экран манітора з любога вугла (178 °) у любой арыентацыі — кніжнай ці альбомнай. Забяспечвае поўныя вуглы агляду ў 178 ° зверху, знізу, злева і справа.

**Мантажны інтэрфейс стандарту VESA:** дазваляе прымацоўваць манітор «MultiSync» да кранштэйнаў або рычагоў іншага вытворцы, калі яны адпавядаюць стандарту VESA.

**Кантроль выявы (англ. «Visual Controller»):** наватарская сям’ю праграмным сродкаў, распрацаваная таварыствам «NEC Display Solutions», якая дае інтуітыўна зразумелы доступ да ўсіх наладаў манітора і дае магчымасць дыягностыкі на адлегласці праз інтэрфейс «Windows», заснаваны на стандартах VESA, DDC/CI. З дапамогаю стандартнага сігнальнага кабелю VGA або DVI, праграмы кантролю выявы дазваляюць асобным карыстальнікам (або адміністратару праграмы) памяншаць агульны кошт валодання, дзякуючы магчымасці абслугоўваць, праводзіць дыягностыку і атрымліваць справаздачы на адлегласці, праз сетку.

**Наладзіць без дотыку (для аналагавага ўваходу)*:** аўтаматычна абірае найлепшыя налады манітора, калі ён запускаецца ўпершыню.

* Толькі для мадэлі PA242W.

**Кіраванне колерам sRGB:** новы палепшаны стандарт кіравання колерам, які забяспечвае тоеснасць колераў на камп'ютарных дысплэях і іншых вонкавых прыладах. Стандарт sRGB грунтуецца на калібраванай прасторы колераў і дазваляе найлепшым чынам перадаваць колеры пры адваротнай сумяшчальнасці з іншымі распаўсюджанымі стандартамі.

**UNIFORMITY (аднароднасць):** функцыя, якая ўраўноўвае нязначныя адхіленні ў аднароднасці белага, якія могуць з'явіцца на экране, паляпшае колер і выраўноўвае аднароднасць яскравасці дысплэя.

**Лепшы водгук:** паскарае пераход між адценнямі шэрага.

**Рэгуляваная стойка з магчымасцю паварочваць:** дадае гнуткасці наладаў для зручнага прагляду.

**Хутказдымная стойка:** дазваляе хутка зняць манітор.

**Тэхналогія аўтаматычнага зацямнення:** аўтаматычна настаўляе ўзровень падсветкі ў залежнасці ад яскравасці навакольнага асвятлення.

**Канцэнтратар USB 2.0** пашырае магчымасці, дазваляючы далучаць лічбавыя камеры, сканеры і шмат іншага.

# Пошук непаладак

**Няма выявы**
- Трэба надзейна далучыць кабель відэасігналу да відэакарткі (камп’ютара).
- Трэба надзейна ўсталяваць відэакартку ў раздым.
- Манітор не падтрымлівае сігнал пераўтваральніка DisplayPort.
- Трэба ўмыкнуць кнопку сілкавання манітора і кнопку сілкавання камп’ютара.
- Праверце, ці падтрымліваецца абраны відэакарткаю або далучанаю прыладай рэжым. (Каб змяніць графічны рэжым, звярніцеся да даведніка па відэакартцы або прыладзе.)
- Праверце сумяшчальнасць манітора і відэакарткі, а таксама рэкамендаваныя налады.
- Праверце, ці не сагнуўся раздым кабелю відэасігналу, і ці не ўсунуліся кантакты ў раздым.
- Праверце ўваходны сігнал: DVI-D, DisplayPort, HDMI або D-Sub.
- Калі пярэдняя лямпачка мігціць жоўтым, трэба праверыць налады вымыкання манітора (гл. старонку 15).
- Калі выкарыстоўваецца DVD-прайгравальнік або іншы від прылады высокай выразнасці, не выкарыстоўвайце сігнал з празрадковаю разгорткай. Калі манітор выяўляе сігнал з празрадковай разгорткай, экраннае меню адлюстроўвае папярэджанне. Калі гэта папярэджанне з’явілася, зрабіце наступнае: націсніце адначасова кнопкі «RESET» (скінуць) і «EXIT» (выхад), каб часова адлюстраваць выяву, якая паступае ад прылады высокай выразнасці. Калі выяву бачна, змяніце разгортку сігналу прылады з празрадковай на прагрэсіўную (не празрадковую). Падрабязней пра тое, як змяніць разгортку сігналу, глядзіце ў даведніку карыстальніка, які пастаўляецца з прыладаю.
- Таймеры «POWER SAVE TIMER» і «OFF TIMER» аўтаматычна вымыкаюць манітор, калі ён не працуе. Забараніце функцыю «POWER SAVE TIMER» (або «OFF TIMER»).

**Кнопка сілкавання не працуе**
- Выцягніце кабель сілкавання манітора з разеткі, каб вымкнуць яго і ўзнавіць налады.

**След выявы**
- следам выявы называецца рэшта або «прывід» выявы, калі папярэдняя выява застаецца бачнаю на экране. У адрозненне ад ЭПТ-манітораў, след выявы на вадкакрышталёвых маніторах назіраецца не заўжды, але варта пазбягаць таго, каб на экране на працягу доўгі час адлюстроўвалася нязменная выява. Каб аслабіць след выявы, вымкніце манітор на такі прамежак часу, на працягу якога адлюстроўвалася папярэдняя выява. Напрыклад, калі выява на маніторы не змянялася на працягу гадзіну і захавалася рэшткавая выява, манітор варта вымкнуць на гадзіну, каб сцерці выяву.

**ЗАЎВАГА.** Як і для ўсіх асабістых дысплэяў, таварыства «NEC Display Solutions» раіць або ўжываць рухомыя ахоўнікі экрана, якія запускаюцца праз пэўны прамежак бяздзейнасці экрана, або вымыкаць манітор, калі ён не выкарыстоўваецца.

**Выява абясколераная**
- Упэўніцеся, што значэнне «COLOR VISION EMU» (імітацыя недахопу каляровага зроку) усталявалі ў «OFF» (не дзейнічае).
- Упэўніцеся, што налады рэжыму выявы такія самыя, як профіль ICC на камп’ютары.
- Усталюйце функцыю «SELF COLOR CORRECTION» (аўтавыпраўленне колеру).
- Калі ўжываецца аналагавы ўваход, адлюструйце выпрабавальны шаблон, улучаны ў кампакт-дыск, які пастаўляецца з маніторам, і скарыстайце функцыю «AUTO ADJUST*» (аўтанастаўленне).
- Спачатку вымкніце манітор кнопкаю сілкавання. Потым улучыце манітор: націсніце разам кнопкі «RESET (PIP)», «SELECT (INPUT)» і кнопку сілкавання. Гэта дазволіць скінуць усе налады колераў да завадскіх значэнняў. Каб скінуць налады, спатрэбіцца прыблізна 10 секунд, а потым на экране адлюструюцца завадскія налады.

**Няроўнасці колеру на экране**
- Паменшыце значэнне «BRIGHTNESS» (яскравасць).
- Усталюйце «UNIFORMITY» (аднароднасць) на «5».

**Малюнак мігціць**
- Калі ўжываецца аналагавы ўваход, адлюструйце выпрабавальны шаблон, улучаны ў кампакт-дыск, які пастаўляецца з маніторам, і скарыстайце функцыю «AUTO ADJUST*» (аўтанастаўленне).

**Паведамленне «OUT OF RANGE» (па-за дыяпазонам; на экране нічога не адлюстроўваецца або адлюстроўваюцца толькі неразборлівыя выявы)**
- Калі выява адлюстроўваецца неразборліва (з прапушчанымі пікселамі) і з’яўляецца папярэджанне «OUT OF RANGE» (па-за дыяпазонам), значыць значэнне частаты сігналу або разрознасці занадта высокае. Абярыце адзін з дазволеных рэжымаў.
- Калі папярэджанне «OUT OF RANGE» адлюстроўваецца на пустым экране, значыць значэнне частаты сігналу выходзіць па-за межы дыяпазону. Абярыце адзін з дазволеных рэжымаў.

* Толькі для мадэлі PA242W.

**Выява няўстойлівая, не ў фокусе або «плавае»**

- Трэба надзейна далучыць кабель відэасігналу да камп'ютара.
- Выпраўце гэта з дапамогаю настаўленняў выявы ў экранным меню, павялічваючы або памяншаючы значэнне выразнасці (FINE).
  Калі рэжым адлюстравання зменіцца, трэба будзе зноўку настаўляць налады выявы ў экранным меню.
- Праверце сумяшчальнасць манітора і відэакарткі, а таксама рэкамендаваныя параметры сінхранізацыі.
- Калі тэкст скажаецца, змяніце рэжым відэа на рэжым з прагрэсіўнай разгорткай частатою 60 Гц.

**Лямпачка на маніторы не гарыць (не бачна ані зялёнага, ані сіняга, ані жоўтага колеру)**

- Трэба ўмыкнуць кнопку сілкавання манітора і далучыць кабель сілкавання.

**Выява недастаткова яскравая**

- Упэўніцеся, што функцыі «ECO MODE» (эканомія) і «AUTO BRIGHTNESS» (аўтаматычная яскравасць) не дзейнічаюць.
- Калі яскравасць самастойна змяняецца, упэўніцеся што функцыя «AUTO BRIGHTNESS» (аўтаматычная яскравасць) не дзейнічае.
- У рэжымах выявы абярыце «HIGH BRIGHT» (высокая яскравасць). Гл. старонку 17.
- Яскравасць вадкакрышталёвага дысплэя памяншаецца пасля працяглага выкарыстання манітора або калі манітор выкарыстоўваецца ва ўмовах моцнага холаду.
- Калі манітор не можа дасягнуць патрэбнага ўзроўню яскравасці, лікавае значэнне яскравасці ў меню будзе мігцець.
- Калі выкарыстоўваецца ўваход HDMI, змяніце параметр «VIDEO LEVEL» (узровень відэа).

**Выява на экране неадпаведнага памеру**

- Выпраўце гэта з дапамогаю настаўленняў выявы ў экранным меню, павялічваючы або памяншаючы адпаведныя значэнні.
- Праверце, ці падтрымліваецца абраны відэакарткаю або далучанаю прыладай рэжым.
  (Каб змяніць графічны рэжым, звярніцеся да даведніка па відэакартцы або прыладзе.)
- Калі выкарыстоўваецца ўваход HDMI, змяніце параметр «OVER SCAN» (разгортванне).
- Настаўце «H.RESOLUTION» або «V.RESOLUTION» (разрознасць па гарызанталі і па вертыкалі) у пашыраным экранным меню, метка 5.

**Відэа не адлюстроўваецца**

- Калі экране няма відэа, вымкніце кнопку сілкавання і ўмыкніце зноўку.
- Упэўніцеся, што камп'ютар не перайшоў у стан эканоміі электраэнергіі (націсніце клавішу на клавіятуры або мышы).
- Некаторыя відэакарткі не выводзяць відэасігнал, калі манітор вымыкаецца (умыкаецца) або адлучаецца (далучаецца) кабель сілкавання зменнага току пры нізкай разрознасці раздыму DisplayPort.

**Яскравасць змяняецца з цягам часу**

- Змяніце параметр «AUTO BRIGHTNESS (АЎТАМАТЫЧНАЯ ЯСКРАВАСЦЬ)» і настаўце яскравасць.

**ЗАЎВАГА.** Калі функцыя AUTO BRIGHTNESS (АЎТАМАТЫЧНАЯ ЯСКРАВАСЦЬ) працуе, манітор аўтаматычна настаўляе яскравасць згодна з наваколлем.
Калі яскравасць навакольнага асяроддзя змяняецца, яскравасць манітора таксама будзе змяняцца.

**Самадыягностыка**

- Вадкакрышталёвы дысплэй можа самастойна дыягнаставаць непаладкі. Калі дысплэй выяўляе непаладку, лямпачка на пярэдняй панэлі мігціць доўгімі і кароткімі прамежкамі, у залежнасці ад віду выяўленае непаладкі.
- Калі лямпачка сігналізуе пра непаладку, звярніцеся да кваліфікаванага абслуговага персаналу.

**USB-канцэнтратар не працуе**

- Упэўніцеся, што USB-кабель далучылі належным чынам. Звяртайце да даведніка па USB-прыладзе.
- Упэўніцеся, што абралі правільны ўваход USB-канцэнтратара (гл. старонку 14).
- Калі ўжываюцца два ўваходныя злучэнні, адлучыце адзін уваходны USB-кабель.
- Вымкніце кнопку сілкавання і ўмыкніце зноўку.

# Функцыя аўтаматычнай яскравасці

Яскравасць вадкакрышталёвага экрана можа аўтаматычна павялічвацца або памяншацца ў залежнасці ад асветленасці памяшкання. Калі ў пакоі светла, яскравасць манітора павялічваецца. Калі ў пакоі цёмна, экран прыцямняецца. Прызначэнне гэтай функцыі — ствараць зручныя для вачэй умовы прагляду ў розных умовах асвятлення.

Прадвызначанае значэнне функцыі аўтаматычнай яскравасці — «OFF» (не дзейнічае).

## Наладжванне

Наступныя крокі дапамогуць абраць дыяпазон яскравасці, які будзе ўжывацца маніторам для функцыі аўтаматычнай яскравасці.

1. Усталюйце ўзровень «BRIGHTNESS» (яскравасць). Гэты ўзровень яскравасці манітор будзе ўжываць, калі ўзровень навакольнага асвятлення стане сама высокім. Настаўляйце гэтае значэнне, калі ў пакоі найбольшая магчымая асветленасць.

   Абярыце «ON» (дзейнічае) у меню «AUTO BRIGHTNESS» (аўтаматычная яскравасць;**малюнак 1**). Потым кнопкамі пярэдняе панэлі перамясціце паказальнік на пункт «BRIGHTNESS»(яскравасць). Абярыце патрэбны ўзровень яскравасці (**малюнак 2**).
2. Вызначце ўзровень «цемры». Гэты ўзровень яскравасці манітор будзе ўжываць, калі ўзровень навакольнага асвятлення стане сама нізкім.
   Калі настаўляеце гэтае значэнне, упэўніцеся што ў памяшканні так цёмна, як толькі можа быць.

   Потым кнопкамі пярэдняе панэлі перамясціце паказальнік на пункт «BRIGHTNESS»(яскравасць). Абярыце патрэбны ўзровень яскравасці (**малюнак 3**).




Малюнак 1




Малюнак 2




Малюнак 3

Калі функцыя «AUTO BRIGHTNESS (АЎТАМАТЫЧНАЯ ЯСКРАВАСЦЬ)» дзейнічае, узровень яскравасці экрана змяняецца аўтаматычна ў залежнасці ад асветленасці памяшкання (**малюнак 4**).




Малюнак 4

Lb: мяжа паміж светлым і цёмным наваколлем; усталёўваецца на заводзе.
L1: узровень яскравасці манітора ва ўмовах высокай асветленасці наваколля (L1 > Lb).
L2: узровень яскравасці манітора ва ўмовах нізкай асветленасці наваколля (L2 < Lb).

Узроўні яскравасці L1 і L2 задаюцца карыстальнікам, каб ураўнаваць змены навакольнага асвятлення.

# Унутраная каліброўка (толькі для мадэлі PA302W)

Проста далучыце вонкавы USB-датчык колеру і адкалібруйце завадскія налады без выкарыстання камп’ютара. Гэтая функцыя выраўноўвае зрух жоўтага колеру, які звычайна з’яўляецца па працяглым выкарыстанні вадкакрышталёвага дысплэя. Пасля выканання ўнутранай каліброўкі абнаўляюцца ўсе рэжымы выяў (PICTURE MODES).
Для належнай каліброўкі трэба папярэдне прагрэць дысплэй на працягу прынамсі 40 хвілін. Калі каліброўка запускаецца да таго як манітор прагрэўся, на экране з’явіцца папярэджанне **(малюнак C. 2)**.

**ЗАЎВАГА.** Самастойная каліброўка можа выконвацца толькі з дапамогай датчыка MDSVSENSOR3.
Звяртайцеся да схемы кнопак (**малюнак A**), калі змяняеце налады ў час калібравання.
Калібраваць манітор можна як у альбомнай, так і ў кніжкай арыентацыі.

**ЗАЎВАГА.** Пачаць каліброўку без камп’ютара можна наступным чынам.
Калі з’явіцца меню «Няма сігналу» (NO SIGNAL), націсніце па чарзе кнопкі «улева» і «управа» і ўтрымлівайце іх націснутымі разам. Адлюструецца цалкам белы ўзор. Пасля гэтага ўсуньце USB-датчык колераў у бакавы (у кніжнай арыентацыі — ніжні) выходны USB-порт. Пачынаць унутраную каліброўку можна з кроку 4.




**Малюнак C.1**

| Схема кнопак | |
|---|---|
| **UP/DOWN (Уверх, уніз):** | перайсці ад параметра да параметра. |
| **LEFT/RIGHT (Улева, управа):** | змяніць значэнне параметра. (пр., «SELF» або «COPY») |
| **SELECT (выбраць):** | перайсці да наступнага кроку калібравання. |
| **EXIT (выйсці):** | вярнуцца на папярэдні крок калібравання. |

**Малюнак A**

1. У пашыраным экранным меню абярыце пункт самастойнае каліброўкі «STAND-ALONE CALIBRATION» (метка «B»).
2. Адлучыце USB-абсталяванне ад бакавога (у кніжнай арыентацыі — ніжняга) выходнага порта USB і націсніце кнопку «SELECT».
3. Усуньце USB-датчык колеру ў бакавы (у кніжнай арыентацыі — ніжні) выходны USB-порт (**малюнак C.1**).
4. Адчыніцца меню калібравання і датчык пачне працаваць.




**Малюнак C.2**

5. Кнопкамі «улева» і «управа» абярыце рэжым (MODE) «самастойна» (SELF). Каб перайсці да наступнага элемента, націскайце «уверх» і «уніз».

6. Каб выканаць гэтую працэдуру, трэба будзе размесціць USB-датчык колеру ў цэнтры панэлі дысплэя (**малюнак C.3**). Нахіліце панэль дысплэя прыкладна на 5 ˚ назад і размясціце USB-датчык колеру ў цэнтры панэлі дысплея (**малюнак C.1**).

**ЗАЎВАГА.** Размяшчайце USB-датчык колеру наўпрост перад дысплэем, каб захіліць яго ад вонкавай крыніцы святла. **НЕ** націскайце прыладаю для калібравання на панэль дысплэя.

Каб пачаць калібраваць, націсніце кнопку «SELECT». У залежнасці ад наладаў карыстальніка, самастойная калiброўка можа заняць некалькі хвілінаў.




**Малюнак C.3**

7. Пасля CALIBRATION SUCCEEDED (ПАСПЯХОВАГА ЗАКАНЧЭННЯ) калібравання з'явіцца паведамленне (**малюнак C.4**) — націсніце кнопку «SELECT».
8. Каб выйсці з рэжыму калібравання, націсніце кнопку «EXIT».




**Малюнак C.4**

# Капіяваць пункт белага (толькі для мадэлі PA302W)

Пункт белага можна капіяваць між дысплэямі. Гэта дазваляе паменшыць розніцу ў адлюстраванні выявамі рознымі дысплэямі.
Функцыя «капіяваць пункт белага» не ўраўноўвае зрух жоўтага колеру, які звычайна з'яўляецца па працяглым выкарыстанні вадкакрышталёвага дысплэя. Калі зрух жоўтага заўважны, зрабіце ўнутраную каліброўку.
Гл. старонку 35.

**ЗАЎВАГА.** Самастойная каліброўка можа выконвацца толькі з дапамогай датчыка MDSVSENSOR3.
Калі змяняеце налады ў час калібравання, звяртайцеся да схемы кнопак (**малюнак A**).
Калібраваць манітор можна як у альбомнай, так і ў кніжкай арыентацыі.

**ЗАЎВАГА.** Пачаць каліброўку без камп'ютара можна наступным чынам.
Калі з'явіцца меню «Няма сігналу» (NO SIGNAL), націсніце па чарзе кнопкі «улева» і «управа» і ўтрымлівайце іх націснутымі разам. Адлюструецца цалкам белы ўзор. Пасля гэтага ўсуньце USB-датчык колеру ў бакавы (у кніжнай арыентацыі — ніжні) выходны USB-порт. Пачынаць капіяваць можна з кроку 4.




**Малюнак B.1**




**Малюнак B.2**

**Дысплэй «A»** — SOURCE (КРЫНІЦА) капіравання пункта белага.
**Дысплэй** «**B**» — мадэль PA302W, на якую капіруецца пункт белага.

1. Усталюйце патрэбны пункт белага на дысплэі «A». Напрыклад, змяніце шпалеры на просты белы фон або запусціце праграму, якая можа запоўніць экран белым колерам — пр., тэкставы рэдактар.
2. Кнопкамі «улева» і «управа» дысплэя «B» абярыце рэжым (MODE) «капіяваць» (COPY) (**малюнак B.3**).
3. Абярыце рэжым выявы (PICTURE MODE) дысплэя «B».
4. Каб выканаць гэтую працэдуру, трэба будзе размесціць USB-датчык колеру ў цэнтры панэлі дысплэя (**малюнак B.4**). Нахіліце панэль дысплэя прыкладна на 5 ˚ назад і размясціце USB-датчык колеру ў цэнтры панэлі дысплея (**малюнак B.1**).

**ЗАЎВАГА.** Размяшчайце USB-датчык колеру наўпрост перад дысплэем, каб захіліць яго ад вонкавай крыніцы святла. **Не** націскайце USB-датчыкам колеру на панэль дысплэя. Націсніце кнопку «SELECT».

5. Каб пачаць вымяраць пункт белага для дысплэя «A», націсніце кнопку «SELECT».
6. Пасля капіравання звестак дысплэя «A» патрэбная яскравасць будзе захоўвацца і ў адлюстроўвацца ў экранным меню дысплэя «B». Пункты белага дысплэяў «A» і «B» мусяць супадаць.

   Калі вынік задавальняе, націсніце кнопку «SELECT». Калі вынік не задавальняе, націсніце кнопку «RESET».
7. Калі трэба пацвердзіць пункт белага дысплэя «B», перанясіце USB-датчык колеру ад дысплэя «A» у цэнтр дысплэя «B» (**малюнак B.2**). Каб прапусціць пацвярджэнне пункта белага дысплэя «B», націсніце кнопку «SELECT», каб перайсці на крок 9, да дакладных наладаў.




**Малюнак B.3**




**Малюнак B.4**




**Малюнак B.5**

8. Каб пацвердзіць пункт белага, націсніце кнопку «SELECT».
9. Калі працэдура скончыцца, з’явіцца паведамленне «FINE TUNING MODE» (рэжым дакладных наладаў).
10. Пры паведамленні «FINE TUNING MODE» (**малюнак B.6)** націсніце кнопку «SELECT», калі вынік задавальняе. Калі вынік не задавальняе, самастойна настаўце пункт белага кнопкамі «улева» і «управа», а потым націсніце кнопку «SELECT».
11. Каб выйсці з рэжыму калібравання, націсніце кнопку «EXIT».




**Малюнак B.6**

# Звесткі па перапрацоўцы і энергасілкаванні



Таварыства «NEC Display Solutions» надае вялікае значэнне ахове навакольнага асяроддзя і разглядае пытанне ўтылізацыі ў якасці адной з пераважных задач у спробе звесці да мінімуму нагрузку на навакольнае асяроддзе. Мы ўдзельнічаем у распрацоўцы экалагічна чыстых вырабаў, і заўжды імкнёмся дапамагчы вызначыць незалежныя стандарты такіх установ, як ISO (Міжнародная арганізацыя па стандартызацыі) і TCO (Шведская канфедэрацыя прафесійных службоўцаў), і адпавядаюць гэтым стандартам.

## Утылізацыя старых вырабаў «NEC»

Мэта ўтылізацыі — атрымаць экалагічныя выгоды ад паўторнага выкарыстання, абнаўлення і аднаўлення або перапрацоўкі матэрыялаў. Прызначаныя для перапрацоўкі месцы сочаць за тым, каб шкодныя для навакольнага асяроддзя складнікі належным чынам і бяспечна знішчаліся. Каб найлепшым чынам утылізаваць свае вырабы, **«NEC Display Solutions» прапануе розныя спосабы ўтылізацыі** і дае парады, як абысціся з вырабам бяспечна для экалогіі, калі выраб выпрацаваў свой рэсурс.

Усе неабходныя звесткі пра ўтылізацыю вырабу і звесткі па канкрэтнай краіне можна знайсці на наступных сайтах:

**http://www.nec-display-solutions.com/greencompany/** (Еўропа),

**http://www.nec-display.com** (Японія) або

**http://www.necdisplay.com** (ЗША).

## Зберагаганне энергіі

Манітор мае пашыраныя магчымасці зберагання энергіі. Калі на манітор паступае сігнал кіравання сілкаваннем стандарту VESA (DPMS), манітор пераходзіць у стан зберагання энергіі. Манітор пераходзіць у адзіны стан зберагання энергіі.

| Рэжым | Спажываная магутнасць | Колер лямпачкі |
|---|---|---|
| Звычайная праца (з прыладамі) | Прыкладна 65 Вт (PA242W)<br>Прыкладна 82 Вт (PA272W)<br>Прыкладна 96 Вт (PA302W) | Зялёны або сіні |
| Стан зберагання энергіі | Меней за 0,5 Вт (PA242W)<br>Меней за 1,4 Вт (PA272W)<br>Меней за 1,4 Вт (PA302W) | Жоўты |
| Вымкнуты | Меней за 0,2 Вт | Не свеціцца |

## Адзнака электронных адходаў (WEEE, дырэктыва Еўрасаюза 2002/96/EC)



**У межах Еўрапейскага саюза**

Заканадаўства Еўрапейскага саюза, якое дзейнічае ў кожнай дзяржаве саюзу, патрабуе, каб адходы электратэхнічных і электронных вырабаў з гэтаю адзнакаю (злева), утылізаваліся асобна ад звычайных бытавых адходаў. Сюды ўваходзяць маніторы і такое электраабсталяванне, як сігнальныя і сілкавальныя кабелі. Калі вам трэба пазбавіцца дысплэя «NEC», калі ласка, кіруйцеся ўказаннямі мясцовых органаў улады або звярніцеся ў краму, дзе набывалі выраб, ці, прытрымлівайцеся ўмоў усіх пагадненняў паміж вамі і таварыствам «NEC», калі такія маюцца.

Адзнака на электратэхнічных і электронных вырабах ужываецца толькі ў краінах Еўрапейскага саюза.

**Па-за межамі Еўрапейскага саюза**

Калі вам трэба ўтылізаваць выкарыстаныя электратэхнічныя або электронныя вырабы па-за межамі Еўрапейскага саюза, звярніцеся да мясцовых органаў нагляду, каб высветліць правільны спосаб утылізацыі.

Зроблена ў Кітаі

Вэб-сайт: http://www.nec-display-solutions.com